

ПАДМУРАК ДЛЯ НЕАІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ ЭКАНОМІКІ 3

АСАБЛІВАСЦІ ПРАЦЫ ВЯСКОВАГА КУР'ЕРА 19



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 СТУДЗЕНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 17 (29386)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль ГУРСКІ, дырэктар Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук:**

*«Праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 годы — комплексны і сістэмны дакумент, які ўлічвае нацыянальныя інтарэсы краіны. Ён распрацаваны на аснове сістэмнага аналізу рэсурснага забеспячэння Беларусі. І на дадзены момант найважнейшым пытаннем з'яўляецца тое, якім чынам мабілізаваць рэсурсы краіны для дасягнення пастаўленых задач і развіцця стратэгічна важных кірункаў. Гаворка ідзе аб інвестыцыйным і інавацыйным патэнцыяле краіны, навуковых распрацоўках і пачынаннях, што зроблены ў тым ліку ў НАН Беларусі, а таксама пра кадравы патэнцыял, які іграе важную ролю ў рэалізацыі гэтай праграмы».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## «Заканадаўства павінна не толькі аператыўна рэагаваць на любыя парушэнні, але і папярэджваць магчымыя пагрозы»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях удасканалення заканадаўства

### Не час для самазаспакаення

По словах кіраўніка краіны, мінулы год стаў для ўсіх павучальным. «Вулічныя шэсці, заклікі да забастовак на прадпрыемствах, дыверсіі на чыгунцы, пагрозы і гвалт у дачыненні да прадстаўнікоў улады, хакерскія атакі на дзяржаўныя інфармацыйныя рэсурсы — далёка не поўны пералік таго, з чым нам давялося сутыкнуцца», — сказаў Прэзідэнт. СТАР. 2



Фота БелТА.

# Будаваць — не бедаваць



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Муляры Лагойскага МПМК-198 Андрэй КЛУСКОЎСКІ і Аляксей ЦЫНКЕВІЧ будуюць пяціпавярховы жылы дом на дваццаць кватэр. Ужо ўзводзіцца трэці паверх, а закачэнне будоўлі адбудзецца ў красавіку. Андрэй і Аляксей жывуць у райцэнтры. Абодва ўдзельнічалі ва ўзвядзенні лагойскага мікраёна «Залатая горка», а яшчэ пабудавалі ў раёне некалькі сацыяльных і адміністрацыйных аб'ектаў і малочнатаварных фермаў.

## КОРАТКА

• Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі з 30-годдзем з дня заснавання навучальнай установы.

• **Сацыяльныя пенсіі, даплаты і надбаўкі пенсіянерам павышаюцца з 1 лютага.**

• У Беларусі праходзіць комплексная праверка баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці Узброеных Сіл.

• **Новы драматычны тэатр прапануе 5 лютага прэм'еру спектакля «Варшаўская мелодыя».**

Праверана часам

## Жалезнае братэрства

### Як развіваецца супрацоўніцтва Беларусі і Кітая?



**Студзень — асаблівы час для беларуска-кітайскіх узаемаадносін. Менавіта ў гэтым месяцы 29 гадоў таму — у пачатку 1992-га — былі ўстаноўлены дыпламатычныя адносіны паміж нашымі краінамі. З той пары многае змянілася, аднак нязменным застаецца вектар плённага ўзаемадзеяння паміж Мінскам і Пекінам. Кітай з'яўляецца стратэгічным партнёрам Беларусі. Узаемавыгаднае супрацоўніцтва развіваецца па многіх кірунках, рэалізуецца шэраг важных праектаў. 31 жніўня 2015 года была падпісана ключавая прэзідэнцкая Дырэктыва № 5 «Аб развіцці двухбаковых адносін Рэспублікі Беларусь з Кітайскай Народнай Рэспублікай». Чым адметнае супрацоўніцтва краін?** СТАР. 6

ISSN 1990 — 763X

# «Заканадаўства павінна не толькі аператыўна рэагаваць на любыя парушэнні, але і папярэджваць магчымыя пагрозы»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўся падрыўная дзейнасць накіроўвалася і фінансавалася з-за мяжы, каардынацыя незаконных акцый ішла праз сацыяльныя сеткі і месенджары, укідвалася інфармацыя, нацэленая на дыскрэдытацыю намаганняў па навядзенні парадку ў Беларусі. «Усё, што я кажу, пацвердзілася, з цягам часу, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Праваахоўныя і іншыя дзяржаўныя органы дазволілі нашай краіне не зваліцца ў прорву чарговай каляровай рэвалюцыі, як бы таго ні хацелі замежныя спонсары пратэстаў. ***Хоць найбольш яркія праявы пратэснай актыўнасці мы спынілі, падстаў для самазаспакаення я не бачу»***.

## Чаго не хапае ў заканадаўстве?

Прэзідэнт заявіў, што з дзеячамі, якія парушалі закон, трэба разабрацца і самы галоўны тут механізм — прававы. «За апошнія гады мы шмат зрабілі ў кірунку лібералізацыі прававых нормаў. Аднак падзеі, якія адбыліся, востра ставяць пытанне: ці не занадта мы захапіліся? ***Заканадаўства павінна не толькі аператыўна рэагаваць на любыя парушэнні, але і папярэджваць магчымыя пагрозы. І гэта самае галоўнае»***, — канстатаваў ён.

Па прапановах грамадзян шэраг неабходных нормаў ужо ўключаны дэпутатамі ў новыя кодэксы аб адміністрацыйнай адказнасці, а таксама ў папраўкі да крымінальнага заканадаўства. «Ці дастаткова гэтага, ці трэба нешта яшчэ, напрыклад у сферы барацьбы з экстрэмізмам, тэрарызмам? Можа быць, варта таксама вярнуцца да заканадаўства аб масавых мерапрыемствах і іншых актаў, што датычацца грамадскай бяспекі? Паглядзець, як за мяжой, у тых жа Францыі і Германіі, ды і ў суседняй Расіі?», — задаў пытанне прысутным кіраўнік краіны.

Ён заявіў, што адказ на яго павінен быць у органаў, якія знаходзяцца сёння на перадавой процідзеяння дэстабілізацыі абстаноўкі ў краіне. Каардынуе адпаведную работу Дзяржаўны сакратарыят Савета Бяспекі, нагляд за выкананнем заканадаўства ажыццяўляе Генеральная пракуратура. Вярхоўны Суд забяспечвае судовы разгляд матэрыялаў, падрыхтаваных праваахоўнымі і іншымі ўпаўнаважанымі органамі.

## Чаму беларусам трэба вучыцца ў расіян

Аляксандр Лукашэнка на нарадзе крыху адышоў ад яе тэмы і выказаў сваё стаўленне да пратэстаў у Расіі і да расследаванняў палітычнага дзеяча Аляксея Навальнага. «Кажуць, Пуцін паўтарае тое, што рабіў Лукашэнка. Ды не, нам трэба вучыцца ў расіян, як рэагаваць на падобныя рэчы. І не толькі ў плане сілавога кампанента», — канстатаваў ён.

«Я закранаю пытанне Расіі яшчэ і таму, што ў Расіі, асабліва іх пратэстуны, занепакоіліся: чаму Лукашэнка маўчыць, нічога не кажа? Мы пра гэта казалі неаднойчы. Сёння тое пацвярджаецца. ***Глыбінная прычына ў тым, што спакойна Беларусі і Расіі жыць не дадуць***. Расія непадуладная, як модна казаць у народзе, вашынгтонскаму «абкаму» і іншым еўрасаюзам. Такая Расія ў свеце нікому не патрэбна. Яе неабходна загнаць у стойла», — так кіраўнік краіны апісаў мэты знешняга ўмяшальніцтва.

Па словах Прэзідэнта, галоўнае адрозненне беларускіх пратэсных падзей ад расійскіх у тым, што ў нас меркавалі ажыццявіць жнівеньскі бліцкрыг, а Расію будуць хістаць доўга.

«Расследаванне беглага, але прынятага назад у Расію нямецкага пратэстуна (Аляксея Навальнага. — **«Зв.»**) — гэта толькі пачатак. Яму я хачу сказаць, паколькі ў свой час мне прыйшлося займацца пытаннямі барацьбы з карупцыяй. ***Калі хтосьці вырашыў змагацца супраць моцных — улады, Прэзідэнта, ажыццяўляць барацьбу з карупцыяй, трэба быць самому крыштальна чыстым»***, — выказаўся Аляксандр Лукашэнка.

«Ніхто Пуціну не даруе, што ён аб'яднаў Расію. Ніхто яму не даруе, што ён спыніў войны ў Расіі, у кучу сабраў краіну. Яму гэта не даруюць ні амерыканцы, ні Еўрасаюз, ні ўнутраныя лібералы. І я ведаю, што ён да гэтага гатовы, вопытны чалавек. Не трэба тут апраўдвацца. Людзі ва ўсім разбяруцца самі», — адзначыў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, «гульня» ў Расіі будзе доўгая — выбары ў Дзяржаўную Думу стануць рэпетыцыяй пратэсных падзей.

«Расію зноў хочуць вярнуць у сярэдзіну 90-х, калі ва ўрадзе, ФСБ, Адміністрацыі Прэзідэнта сядзелі дарадцы са Злучаных Штатаў Амерыкі, НАТА і раілі, што рабіць са зброяй, атамнай зброяй і гэтак далей», — упэўнены кіраўнік краіны.

Ён дадаў, што пастаянна з калегамі з Расіі абмяркоўвае пытанні бяспекі, і мы адзіныя ў сваёй пазіцыі. ***«Мы да гэтага былі на адным баку барыкад. Будзем і далей ваяваць за тое, каб людзьмі звацца»***, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

## Пра палітычную амністыю

Прэзідэнт заявіў, што «палітычная амністыя будзе заўтра», калі яму пакажуць хоць аднаго асуджанага па палітычных прычынах.

Ён падкрэсліў, што не трэба мець ілюзій пра палітычных вязняў: яны сядзяць у турме за злачынствы, у тым ліку эканамічнага характару.

«Слухайце, трэба спыніць гэтую ўсялякую балбатню. Нават ім, калі былі ў СІЗА, я сказаў, калі яны мне задавалі галоўнае пытанне: «Калі нас выпусцяць?» Я ім усім выклаў сваё бачанне: усё, што ўкрадзена ў народа, вярні. Тады мы будзем з вамі весці размову, і я паспрабую адказаць на ваша пытанне. Да гэтага часу чакаю, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — ***Калі чалавек не хоча сядзець у турме за злачынства эканамічнае, фінансавае, крымінальнае, аддай апошняе, калі ў цябе ёсць***. Мы паказалі ўсё, што ёсць. Калі не, суд вырашыць. Як вырашыць суд, так і будзе. Вось і ўся палітычная і іншая амністыя».

## «Нам хаваць няма чаго»

Па словах Прэзідэнта, нязгодныя, носьбіты «свайго» меркавання былі ў краіне заўсёды — і гэта нармальна. Нічога новага, на думку кіраўніка краіны, за выключэннем павелічэння працягласці перыяду пратэстаў, не адбылося. «Усё гэта мы праходзілі. Адзінае — пандэмія налажыла пэўны адбітак», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заявіў, што гатовы актыўна працаваць, весці дыялог з тымі, хто «заблытаўся». Па яго словах, усе, хто хацеў выказаць сваю пазіцыю, выступалі на дыялогавых пляцоўках.

«На гэтых дыялогавых пляцоўках мы выкрышталізоўваем меркаванні і падымаем іх наверх, на Усебеларускі народны сход. Нас зараз пачынаюць крытыкаваць: «Гэта не тое, што гэта за сход?» Гэта робіць перш за ўсё беглыя», — сказаў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што прадстаўнікі апазіцыі за мяжой аб'явілі свой альтэрнатыўны сход і адмовіліся прызнаваць Усебеларускі. «Вы яго не прызнаеце. Хто вас будзе выбіраць на гэты Усебеларускі народны сход? Хто вас будзе туды запрашаць? Аб'явілі альтэрнатыву — праводзьце яго ў замежжы», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Як ён заявіў, нягледзячы на тое, што ўсе дэлегаты выбраны, прадстаўнікоў апазіцыі, тых, хто хоча размаўляць, запросяць.

«Нам хаваць няма чаго. Грамадства павінна ведаць нашу пазіцыю. Улада павінна адкрыта сказаць. Не выкручвацца, — акцэнтаваў кіраўнік краіны.

З цягам часу, запэўніў Аляксандр Лукашэнка, КДБ абнародуе факты, як дэструктыўныя сілы спрабавалі «ўзрываць дамы і вуліцы», адкуль ішла ўзрыўчатка для гэтага.

«Я пакуль не называю людзей, не называю групы. Некаторыя ўжо вядомыя. Я думаю, у найбліжэйшы час мы гатовыя гэта прадэманстраваць нашаму грамадству. І вось, калі б узарвалі хоць бы адзін дом, то нашы ачумелыя ў Мінску, што турбуюцца за гвалт, шмат бы зразумелі. Ды дзякуй КДБ і міліцыі, якія нейтралізавалі гэтых «дзеячаў», — дадаў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт, нагадаў, што абараняць сваю краіну — яго канстытуцыйны абавязак: «І я буду абараняць, чаго б мне гэта ні каштавала. Трэба — на танку, на БМП, з аўтаматам у руках».

Ён яшчэ раз нагадаў, што абараняць сваю краіну будзем па законе. Усе змяненні ў яго павінны прапісаць у нарматыўна-прававых актах і данесці да людзей.

«Пакуль ёсць час, давайце будзем працаваць, выдаляць гэтыя хібы, каб людзі ўбачылі, што мы чуем нават меншасць», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Знешняя палітыка

# НАТУРАЛЬНЫ ШЛЯХ

## Прадукцыйная і глыбокая інтэграцыя ў СНД — адзін з прыярытэтных вектараў знешняй палітыкі Беларусі

**Аб гэтым заявіў учора міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ на пасяджэнні Савета пастаянных паўнамоцных прадстаўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД пры статутных і іншых органах Садружнасці, паведамляе БелТА.**

«Глыбокая прадукцыйная інтэграцыя на прасторы СНД з найбольш блізкімі суседзямі не толькі геаграфічна, гістарычна, але і па абавязку з'яўляецца натуральным шляхам развіцця для Беларусі і адным з прыярытэтных вектараў знешняй палітыкі дзяржавы», — сказаў Уладзімір Макей.

Міністр назваў СНД (Беларусь сёлета старшынствуе ў Садружнасці) «сталай сучаснай рэгіянальнай арганізацыяй і ўнікальнай дыялогавай пляцоўкай, якая ўлічвае інтарэсы дзяржаў-удзельніц». Ён падкрэсліў, што намаганні краін Садружнасці павінны быць накіраваны на дасягненне агульнай мэты: рэгіянальнай кансалідацыі і прагрэсу.

«Лічу нашай агульнай задачай далейшае ўмацаванне патэнцыялу Садружнасці, узмацненне яе пазіцый на міжнароднай арэне і пошук пунктаў росту, якія нададуць новы імпульс і дынамізм далейшаму развіццю СНД», — дадаў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства.

**У размове з журналістамі Уладзімір Макей зрабіў некалькі заяў і па іншых кірунках нашай знешнай палітыкі.**

### «У ХУТКІМ ЧАСЕ ВЫЗНАЧЫМСЯ»

У прыватнасці, закранаючы тэму адносін з ЗША, міністр заявіў, што Беларусь заўсёды гатовая да плённага і раўнапраўнага ўзаемадзеяння. Ён падкрэсліў, што беларускі бок зацікаўлены ў найхутчэйшым прыбыцці пасла ЗША ў Мінск. Таксама ў Беларусі цяпер ідзе пошук новай кандыдатуры на пасаду кіраўніка дыпмісіі ў Вашынгтоне (намеснік міністра замежных спраў Алег Краўчанка, назначаны раней на гэтую пасаду, памёр у 2020 годзе). «Цяпер мы працуем над кандыдатурай новага пасла. Ужо некалькі кандыдатур ёсць, мы будзем дакладваць аб нашых прапановах кіраўніку дзяржавы. Думаю, што ў найбліжэйшы час мы вызначымся з гэтай кандыдатурай», — заявіў Уладзімір Макей.

### «ВЫМУШАНЫ РЭАГАВАЦЬ»

Яшчэ адна заява кіраўніка беларускага знешнепалітычнага ведамства датычылася дзейнасці замежных дыпламатаў у нашай краіне. «Мы цяпер бачым, што некаторыя паслы, якія прадстаўляюць Еўрапейскі саюз, размяшчаюць у сябе інфармацыю, пасты антыдзяржаўнай накіраванасці. Мы пакуль не рэагуем на гэтыя факты, але адсочваем іх. Будзьце ўпэўнены, што мы дадзім вельмі канкрэтную, прадметную і строгую ацэнку такім фактам», — заявіў ён.

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства звярнуў увагу, што паслы павінны садзейнічаць збліжэнню краін і народаў, развіццю двухбаковага супрацоўніцтва. «Калі пасол адназначна займае лінію, накіраваную супраць улад краіны, у якой ён знаходзіцца, значыць, такі пасол не павінен займаць адпаведную пасаду», — сказаў міністр.

### «ВЕРХ КРЫВАДУШНАСЦІ»

Міністр замежных спраў Беларусі пракаментаваў рашэнні Брусэля і Вільнюса адносна работы санаторыя «Беларусь» у Друскінінкаі.

«Некаторы час таму, калі з боку нашых еўрапейскіх партнёраў зайшла размова аб тым, што трэба ўвесці санкцыі ў адносінах да Беларусі, выразна гучала думка, што гэтыя санкцыі не павінны аказаць уплыў на простага чалавека, народ Беларусі, прадстаўнікоў іншых краін. Што мы бачым сёння: гэтыя 350 чалавек, грамадзян Літвы, апынуліся ў бясправным стане», — звярнуў увагу Уладзімір Макей.

Ён заўважыў, што супрацоўнікам санаторыя з цяжкасцю выплацілі зарплату за снежань, а цяпер ім прапаноўваюць знайсці новую работу — у 12-тысячным горадзе, дзе ўжо дзве тысячы беспрацоўных. «Для мяне гэта верх крывадушнасці і двудушнасці: з аднаго боку, заяўляюць аб неабходнасці абароны правоў чалавека, з другога боку, прымаюцца рашэнні, каб ствараць негатыўную сітуацыю для радавых грамадзян, і тым самым нібыта выклікаць пратэсны настрой у адносінах да ўлады ў Беларусі. Абсалютна крывадушны і двудушны падыход», — падкрэсліў міністр.

«Беларускія «гастралёры», якія раз'язджаюць па еўрапейскіх гарадах і вёсках, заклікаюць да ўвядзення чарговых санкцый супраць краіны і беларускага народа. Калі ўзнікла гэтая сітуацыя з санаторыем у Друскінінкаі, яны адразу ж паспрабавалі адхрысціцца: «Не, гэта ўлады Беларусі вінаватыя, мы тут ні пры чым». Тэатр абсурду», — так ахарактарызаваў гэтыя дзеянні Уладзімір Макей.

Ён таксама заявіў аб спробах адкрытай хлусні з боку літоўскіх суседзяў. У Літве заяўляюць, што санаторый у мінулым годзе не працаваў з-за пандэміі. Але, паводле інфармацыі міністра, там прайшлі аздараўленне 8 тысяч грамадзян, з іх 1,5 тысячы дзяцей, сярод якіх амаль 200 — дзеці-інваліды.

Уладзімір Макей яшчэ раз падкрэсліў, што беларускі бок не мае намеру пакідаць у бядзе супрацоўнікаў санаторыя і працуе над вырашэннем сітуацыі, што склалася. Аднак гэтаму перашкаджаюць некаторыя складанасці: у Брусэлі заяўляюць, што дадзеныя пытанні трэба вырашаць на двухбаковай аснове з Вільнюсам, у той жа час у Літве спасылаюцца на рашэнні Еўрапейскага саюза. «Вось ён, рэальны клопат аб правах чалавека ў дзеянні», — рэзюмаваў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства.

Навука і інавацыі

# ПАДМУРАК ДЛЯ НЕАІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ ЭКАНОМІКІ

**У найбліжэйшыя гады асноўную ўвагу беларускія навукоўцы будуць аддаваць шасці прыярытэтным напрамкам, сярод якіх лічбавыя інфармацыйныя тэхналогіі, медыка-біялагічныя распрацоўкі (хімічныя, мікрабіялагічныя, фармацэўтычныя, генетычныя), энергетыка і рацыянальнае прыродакарыстанне, машынабудаванне (у тым ліку прыборабудаванне і інавацыйныя матэрыялы), аграпрамысловыя і харчовыя тэхналогіі і бяспека чалавека і дзяржавы.**

— Усе вынікі, атрыманыя акадэмічнымі вучонымі, маюць высокую практычную значнасць. Навука цесным чынам інтэграваная ў беларускую эканоміку, працуючы з усімі без выключэння буйнымі вытворцамі, — паведаміў журналістам **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Мы не толькі прадуцыруем новыя ідэі і распрацоўваем эксперыментальныя ўзоры, але на кааперацыі з галінамі і прадпрыемствамі творча і эфектыўна мадэрнізуем тэхналагічныя працэсы, інтэлектуальна забяспечваючы серыйнае асваенне.

Летась па выніках выканання праектаў Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь, на базе НАН было створана дзевяць новых вытворчасцяў, якія выпускалі запатрабаваную ў краіне і за мяжой прадукцыю: паўправадніковыя генератары, аптычныя кампаненты і лазерныя сістэмы з дыёднай напампоўкай новага пакалення, кампазітныя матэрыялы для 3D друку; абсталяванне для іонна-плазменнай ушчыльнення маркёра, аўтаматызаваны модуль для ўзбагачэння мінеральнай сыравіны, мікраўгнаенні таргетнага і пралангаванага дзеяння, комплекс для мікракланальнага размнажэння садовых карысных раслін; ферменты для сінтэзу лекавых субстанцый і атрымання найноўшых дыягнастыкумаў. А ўсяго ў НАН створана ўжо больш як 100 вытворчасцяў.

Як адзначыў Уладзімір Гусакоў, акадэмія ўдзельнічае ў буйных сістэмных праектах, якія ствараюць аснову мадэрнізаванай, ці, як цяпер прынята казаць, неаіндустрыяльнай эканомікі: гэта атамная энергетыка, аэракасмічная і біятэхналагічная галіны, фармацэўтыка, IT-сфера, электратранспарт, асваенне палярных раёнаў Зямлі і іншыя.

Акадэмія навук уяўляе буйны даследчы цэнтр, які развіваецца па тыпе навукова-вытворчай карпарацыі. Практычна кожная акадэмічная арганізацыя мае вытворчыя «пункты росту» — участкі, якія выпускаюць запатрабаваную прадукцыю.

— Напрыклад, прадпрыемствам «Акадэмфарм» выпускаецца супрацьвірусны прэпарат так званай залатой лініі — «Флустоп», у 2020 годзе асвоены выпуск прэпарату антытрамбознага дзеяння — «Рываксан». Яго імпартны аналаг каштуе ад 400 да 500 рублёў за ўпакоўку, а наш прэпарат каштуе 140 рублёў, — паведаміў Уладзімір Гусакоў. — Навукова-вытворчым цэнтрам «Хімфармсінтэз» Інстытута біяарганічнай хіміі выпушчаны і рэалізаваны высокаэфектыўныя супрацьпухлінныя лекі дзесяцці найменняў (на суму каля 6,5 млн рублёў).

**Першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Андрэй КАСОЎСКІ** расказаў, што цяпер ва ўрадзе разглядаецца пералік дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм на 2021—2025 гады. У рамках іх рэалізацыі плануецца стварыць больш як дзве тысячы навінак, у тым ліку эксперыментальны ўзор грузавога электрамабіля, пнеўматычную сеялку з шырынёй захопу 12 м, праграмна-апаратны комплекс «Нацыянальная SMART-платформа для аўтаматызаванай сістэмы збору і верыфікацыі даных сродкаў уліку вады, газу і энергарэсурсаў».

Таксама ў планах — распрацоўка высокапрадукцыйнага генератара выяў з прымяненнем тэхналогіі прасторава-светлавой мадуляцыі, тэхналогіі вытворчасці фармацэўтычнай субстанцыі на аснове цыклапептыдаў, гатовай формы лекавага сродку для лячэння раку лёгкіх, метаду хірургічнага лячэння пры захворваннях і пашкоджаннях пазваночніка з прымяненнем новых палімерна-кампазіцыйных імплантатаў. На аснове інавацый, распрацаваных па заданнях праграм, уключаных у праект пераліку, плануецца выпусціць прадукцыі не менш як на 3,5 млрд рублёў і пятую ае частку пастаўляць на экспарт.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Блізкая ўлада

## ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 30 студзеня, з 9:00 да 12:00 праводзяць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА . Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Юрый Уладзіміравіч ТРУШЧАНКА. Тэл. 8 017 222 44 44.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Саудаўскай Аравіі раскрылі карупцыйную схему, па якой за мяжу вывелі больш за $3 млрд



Цэнтральны банк Саудаўскай Аравіі выявіў карупцыйную схему з удзелам супрацоўнікаў банкаў, па якой на замежныя рахункі было незаконна выведзена 11,5 млрд саудаўскіх рыялаў (больш за $3 млрд). Пра гэта, як перадае тэлеканал Al Arabiya, паведаміў афіцыйны прадстаўнік Упраўлення па наглядзе і барацьбе з карупцыяй каралеўства Ахмед аль-Хусэйн. Паводле яго слоў, дзякуючы палітыцы кантролю, якая праводзіцца цэнтрабанкам, і прафесіяналізму спецыялістаў упраўлення ўдалося раскрыць фінансавае злачынства. «Было ўстаноўлена дачыненне шэрагу банкаўскіх служачых да атрымання хабараў ад злачыннай групоўкі, у якую ўваходзілі мясцовыя жыхары, у абмен на ўнясенне ананімных грашовых сум і іх пераклад на замежныя рахункі», — расказаў Ахмед аль-Хусэйн. У залежнасці ад цяжару правапарушэння абвінавачаным пагражае да 15 гадоў турэмнага зняволення.

### Брытанскі штам каранавіруса выявілі ў 33 краінах Еўропы

Паўднёваафрыканскі варыянт — у 16. Пра гэта заявіў дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) Ханс Клюге на брыфінгу ў Капенгагене, паведаміла ТАСС. «Вакцыны, з аднаго боку, усяляюць надзею. З іншага боку, новыя варыянты віруса, якія выклікаюць заклапочанасць, уяўляюць вялікую нявызначанасць і рызыку», — адзначыў ён. Лакдаўны, уведзеныя для абмежавання распаўсюджвання віруса, асабліва новых варыянтаў, прывялі да памяншэння колькасці новых выпадкаў у рэгіёне: у 30 краінах назіралася значнае зніжэнне колькасці захворванняў за 14 дзён. «Тым не менш паказчыкі перадачы інфекцыі ў Еўропе па-ранейшаму вельмі высокія, што адбіваецца на сістэмах аховы здароўя», — заўважыў эксперт.

### Першыя турысты паляцяць на МКС у студзені 2022 года



Першыя турысты на Міжнародную касмічную станцыю (МКС) будуць дастаўлены на пілатуемым караблі Crew Dragon кампаніі SpaceX не раней за студзень 2022 года, паведаміла кампанія Axiom Space, якая плануе арганізацыю касмічнага турызму. Раней яна афіцыйна абвясціла, што першымі турыстамі стануць бізнесмены з ЗША, Канады і Ізраіля — Лары Конар, Марк Паці і Эйтан Сціббэ. Разам з першымі турыстамі на МКС адправіцца былы астранаўт НАСА Майкл Лопес-Алегрэ. Кошт васьмідзённага наведвання МКС ацэньваецца ў 55 мільёнаў долараў. Перад палётам турысты павінны будуць прайсці 15-тыднёвую падрыхтоўку на Зямлі. Палёты з касмічнымі турыстамі ў далейшым плануецца ажыццяўляць два-тры разы на год.

Надвор'е

# Валёнкі пакуль не хавайце

Пасля непрацяглай адлігі да нас вярнулася зімовае надвор'е са снегам і марозам да мінус дванаццаці

**Як мінімум — да канца студзеня (а па папярэдніх прагнозах, амаль увесь люты) у нашай краіне захаваецца зімовы характар надвор'я. Ападкі будуць ісці ў выглядзе снегу, а тэмпература паветра на працягу сутак у асноўным будзе знаходзіцца ніжэй за нулявую адзнаку — уначы пры праясненнях магчыма паніжэнне да мінус 10—12 градусаў. Такі тэмпературны фон блізкі да ўзроўню студзеньскай нормы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Характэрна, што нягледзячы на дажджы, багатыя запасы снегу далёка не ўсюды «змыла». Паводле звестак на раніцу чацвярга, вышыня снежнага покрыва па краіне складае 1—29 см, у аэрапорце Гродна вышыня гурбаў 43 см.

Сёння ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны таксама пройдзе снег, месцамі моцны. У асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца заходні, паўночна-заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра будзе ад нуля да мінус 5 градусаў.

Халадней пачне ўжо ў суботу. У гэты дзень месцамі па краіне, а ўдзень па поўдні пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні, заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—10 марозу, пры праясненнях — да мінус 12 градусаў. Удзень будзе 1—6 градусаў ніжэй за нуль.

Паводле прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у нядзелю месцамі па краіне, а ўначы па паўднёвым усходзе таксама чакаецца кароткачасовы снег. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні, заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ўсё тыя ж 4—10 марозу, пры праясненнях — да мінус 11 градусаў. Удзень будзе ад мінус 1 да мінус 7 градусаў. Паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня істотнага пацяплення (ды і пахаладання таксама) не прадбачыцца. Зіма...

**Сяргей КУРКАЧ.**






# Голас рэгіёна

**Удзельнікі VI Усебеларускага народнага сходу — дэлегаты ад Гомельшчыны на галоўны форум краіны — правялі выніковую рэгіянальную сустрэчу ў абласным цэнтры. Яны абмеркавалі асноўныя кірункі перспектыўнай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў найбліжэйшыя пяць гадоў.**




Фота БелТА.

У VI Усебеларускім народным сходзе будуць удзельнічаць 310 дэлегатаў ад Гомельшчыны. Трэба адзначыць, што рэгіён актыўна рыхтаваўся да ўдзелу ў галоўным форуме краіны. Так, у вобласці правялі звыш 200 дыялогавых пляцовак, удзельнікамі якіх сталі больш за шэсць тысяч чалавек. Каля 800 прапаноў ад жыхароў Гомельшчыны паступіла таксама ў грамадскія прыёмныя, якія праходзілі пры абласным і гарадскім выканаўчых камітэтах, а таксама пры райвыканкамах. Як вынік праведзенай работы — больш чым чатырыста ўнесеных прапаноў, адрасаваных у рабочую групу дэлегатаў Гомельшчыны на Усебеларускі народны сход.

«Атрыманыя водгукі пераканаўча даказалі: у грамадстве ёсць запыт на канструктыўны дыялог. А Усебеларускі народны сход — асобая форма народаўладдзя, рэальны дэмакратычны інстытут, які дае магчымасць прадстаўнікам усіх рэгіёнаў і галін, людзям розных сацыяльных груп, прафесій і ўзростаў прыняць непасрэдны ўдзел у абмеркаванні найбольш важных пытанняў у жыцці грамадства і дзяржавы, далейшага шляху развіцця краіны», — падкрэсліў **намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ.**

Удзельнікамі абласной сустрэчы дэлегатаў агульнарэспубліканскага форуму сталі першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў, першы віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў, намеснік прэм'ер-міністра Юрый Назараў, а таксама кіраўнікі міністэрстваў, дэпутаты, прадстаўнікі выканаўчай улады і працоўных калектываў Гомельскай вобласці.

На сходзе былі названыя асноўныя палажэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны да 2025 года ў цэлым. Так, эканамічная палітыка на перспектыву захавае тры характэрныя рысы. Як было адзначана, па-першае — наша краіна працягне захоўваць сацыяльную скіраванасць. Галоўная мэта — рост дабрабыту людзей, павелічэнне даходаў насельніцтва, забеспячэнне занятасці, даступнасці жылля, высокатэхналагічных медыцынскіх паслуг і адукацыі. Другі кірунак — развіццё індустрыяльнага патэнцыялу ў традыцыйных галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі, але толькі на новай тэхналагічнай базе і лічбавай аснове. Трэці — гэта фарміраванне новых высокатэхналагічных галін і прадпрыемстваў.

Аб асноўных перспектыўных кірунках Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ўдзельнікам сустрэчы расказаў **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ.** Ён звярнуў увагу на тое, што адзін з ключавых кірункаў будучай пяцігодкі — павышэнне патэнцыялу рэгіёнаў як галоўных лакацый для рэалізацыі праектаў рэальнага сектара эканомікі.

— Наша мэта — скараціць разрыў ва ўзроўні і якасці жыцця людзей незалежна ад месца іх пражывання, — падкрэсліў Аляксандр Чарвякоў.

Прынамсі, у дачыненні да Гомельшчыны міністр агучыў пяць ключавых кірункаў далейшага развіцця патэнцыялу рэгіёна.

— На тэрыторыі вобласці размешчаны ўнікальныя вытворчасці — амаль 100 % рэспубліканскіх аб'ёмаў пракату сталі, шкла, халоднацягнутага дроту, з мінулага года адкрыта вытворчасць беленай цэлюлозы, — адзначыў міністр эканомікі. — Як мы бачым, гэта сыравінныя рэсурсы альбо паўфабрыкаты, таму для рэгіёна вельмі важна далейшае ўдасканаленне тэхналагічных ланцужкоў для атрымання канчатковых прадуктаў.

Міністр адзначыў, што сур'ёзнае развіццё атрымае прыватны бізнес, які неабходна далучаць да работы з буйнымі прадпрыемствамі, ствараць кластары і працаваць у рэчышчы імпартазамяшчэння.

Актуальным пытаннем для рэгіёнаў таксама стане задзейнічанне патэнцыялу свабодных эканамічных зон. Так, сёння СЭЗ «Гомель-Ратон» мае магчымасць стварэння сучасных экспартаарыентаваных прадпрыемстваў у 13 раёнах Гомельскай вобласці, а гэта каля 400 гектараў зямлі і больш за 20 прамысловых пляцовак для выдзялення буйным інвестарам, аднак няма развітой інфраструктуры.

— Дзяржава гатова падставіць плячо і прафінансаваць дадзеныя падобныя аб'екты, але гэта павінны быць канкрэтныя інвестыцыйныя праекты, — падкрэсліў міністр эканомікі.

Ужо ў бягучым годзе прадугледжаны фінансавыя рэсурсы для павелічэння энергетычных магутнасцяў на ўчастку СЭЗ у Мазырскім раёне. Перспектыўнымі кірункамі для Гомельшчыны могуць стаць вытворчасці па выпуску экалагічнай упакоўкі на аснове цэлюлозы, паперы, кардону. Патэнцыял для павелічэння выпуску гатовай прадукцыі — павелічэнне глыбіні перапрацоўкі нафты і прадуктаў дрэваапрацоўкі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

---

**Кампетэнтна**

**Максім РЫЖАНКОЎ:**

## «ТОЛЬКІ ПРАЗ ДЫЯЛОГ, ЗГУРТАВАННЕ МОЖНА ВЫРАШЫЦЬ УСЕ ЗАДАЧЫ»

**Толькі праз дыялог, кансалідацыю, згуртаванне народа можна вырашыць усе задачы па далейшым развіцці краіны. Перакананасць у гэтым выказаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў.**

Ён падкрэсліў, што беларускае грамадства, дзяржава імкнуцца да далейшага развіцця. «Сапраўды, нам патрэбны нейкі, можа быць, больш шырокі грамадскі дыялог. Мы рушым наперад, і дзецям сваім мы павінны перадаць краіну яшчэ лепшай, яшчэ больш развітой, але пры гэтым незалежнай, стабільнай, шчаслівай», — заўважыў Максім Рыжанкоў.

На яго думку, пустымі заклікамі, эмоцыямі гэтыя пытанні не вырашыць. «Толькі праз дыялог у грамадстве, праз кансалідацыю грамадства, згуртаванне народа, яднанне, павышэнне ўзаемнага даверу мы можам вырашыць усе задачы», — лічыць першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Максім Рыжанкоў звярнуў увагу, што Усебеларускі народны сход — пляцоўка для абмеркавання маштабнага пласта самых актуальных пытанняў развіцця дзяржавы, і гэтую магчымасць трэба выкарыстоўваць максімальна эфектыўна.



Фота БелТА.

**Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЯНКЕВІЧ, намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ, намеснік прэм'ер-міністра Юрый НАЗАРАЎ і намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.**

---

Слова — дэлегатам

## «Моладзь гатова ехаць у глыбінку. Неабходна стварыць для іх камфортныя ўмовы»



**Ірына КРАЛЕВІЧ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы.**

Скончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт. Матэматык, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Аўтар больш чым 100 навуковых і вучэбна-метадычных публікацый.

Працавала настаўнікам матэматыкі сярэдняй школы № 2 у Мазыры, асістэнтам кафедры матэматычнага аналізу, потым — старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры матэматыкі і методыкі выкладання матэматыкі, дэканам фізіка-матэматычнага факультэта Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна.

Сама Ірына Мікалаеўна лічыць сябе чалавекам ініцыятыўным. Менавіта ў часы, калі яна была дэканам фізіка-матэматычнага факультэта, адкрыты тры новыя спецыяльнасці і арганізавана работа эксперыментальнай пляцоўкі «школа—ВНУ», якую стварылі для аказання дапамогі школам Палескага рэгіёна ў падрыхтоўцы вучняў па матэматыцы і інфарматыцы.

Ужо будучы дэпутатам, яна ініцыявала ўнясенне ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб раслінным свеце» прапановы аб адмене кампенсацыйных выплат за выдаленне аб'ектаў расліннага свету пры правядзенні ў рыбгасах ачышчальных работ на вадаёмах. Гэта дазволіла беларускім рыбгасам накіроўваць сэканомленыя сродкі на далейшае развіццё вытворчасці. Дзякуючы яе актыўнасці пабудавана АЗС у Лельчыцкім раёне, адсутнасць якой прыносіла масу незручнасцяў жыхарам раёна, цягнік Гомель—Брэст спыняецца на станцыі Капцэвічы, будуюцца дзіцячыя пляцоўкі ў пасёлках. Ірыну Кралевіч паважаюць выбаршчыкі, таму што яна не толькі слухае, але і чуе іх просьбы.

Ірына Кралевіч стала дэлегатам УНС не ўпершыню, таму, зыходзячы з уласнага вопыту, пераканалася: усе канструктыўныя прапановы будуць улічаны і рэалізаваны.

— Усебеларускі народны сход — гэта аб'яднанне грамадзян у вызначэнні асноўных кірункаў развіцця дзяржавы, — гаворыць яна. — Гэта ўнікальная магчымасць для кожнага з нас узяць удзел у лёсе роднай краіны. На маю думку, значным з'яўляецца кожны этап УНС: падрыхтоўка, правядзенне і наступная рэалізацыя намечаных мэт і пастаўленых задач. Беларусы аб'ядналіся ў імя міру, стабільнасці і развіцця. Па ўсёй краіне праходзяць дыялогавыя пляцоўкі, грамадзяне ўносяць прапановы ў парламент, звяртаюцца ў мясцовыя органы ўлады, абмяркоўваюць наспелыя праблемы ў працоўных калектывах, абіраюць і дэлегуюць сваіх прадстаўнікоў для ўдзелу ва УНС. Можна сказаць, на практыцы рэалізуецца першы ў гэтым годзе ўказ кіраўніка дзяржавы — аб аб'яўленні 2021 года «Годам народнага адзінства». Найважнейшы аспект УНС — кожны чалавек будзе пачуты. Менавіта таму шырокае прадстаўніцтва на сходзе ўсіх слаёў насельніцтва дазволіць комплексна, сістэмна і шматаспектна абмеркаваць існуючыя праблемы і выпрацаваць Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на наступную пяцігодку.

Ірына Мікалаеўна лічыць, што ў будучай пяцігодцы важна аддаць асаблівую ўвагу развіццю рэгіёнаў. А гэта дзяржаўная падтрымка ў мадэрнізацыі і стварэнні вытворчасцяў, развіццё сістэмы медыцынскага абслугоўвання, стварэнне камфортных умоў жыццядзейнасці насельніцтва. Дэпутат упэўнена, што моладзь гатовая вярнуцца дадому пасля заканчэння ВНУ і каледжаў, але для гэтага дзяржава павінна стварыць ёй умовы.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**




Дыялог

# Сацыяльныя арыенціры

## Што прапаноўваюць жыхары Міншчыны для больш камфортнага жыцця

**Актуальныя пытанні развіцця і ўдасканалення сацыяльнай сферы абмеркавалі ўдзельнікі Мінскай абласной дыялогавай пляцоўкі, якая прайшла ў Чэрвені. На ёй прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Міншчыны. Яны маглі свабодна выказацца па тых ці іншых праблемах і шляхах іх вырашэння.**


Фота прэс-службы Мінаблвыканкама.

Чаму менавіта ў Чэрвеньскім раёне была арганізавана пляцоўка? На гэтае пытанне адказаў **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ.** На яго думку, у Чэрвені шмат зроблена і робіцца па развіцці сацыяльнай сферы. Каласальная работа праведзена ў гэтым кірунку напярэдадні абласнога свята-фестывалю працаўнікоў вёскі «Дажынкі», якое восенню мінулага года прайшло ў райцэнтры. Тут пасля рэстаўрацыі адкрыты будынак краязнаўчага музея, пабудаваны фізкультурна-аздараўленчы цэнтр, добраўпарадкаваны дваровыя тэрыторыі, заасфальтаваныя некаторыя вуліцы, абноўлены фасады адміністрацыйных, сацыяльных, культурных ды іншых аб'ектаў. Ігар Яўсееў дадаў, што пры наведванні сацыяльных установ ён задаваў пытанні пажылым людзям, што працавалі ў розных галінах народнай гаспадаркі, аб узроўні іх пенсій. Па іх словах, яны задаволеныя. Іх больш хвалюе тое, каб у краіне былі мір, лад ды згода. На дыялогавых пляцоўках, на якіх бывае памочнік Прэзідэнта, грамадзяне станоўча ацэньваюць зробленае ў краіне. Аднак, вядома, без праблем жыццё не бывае. Людзей цікавіць, як будуць выдавацца крэдыты на будаўніцтва жылля, як будзе развівацца медыцына, якія змены адбудуцца ў выкарыстанні сямейнага капіталу.

**Дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Вадзім ГІГІН,** які выступіў мадэратарам абласной пляцоўкі, падкрэсліў, што тэматыка дыялогавых пляцовак і колькасць удзельнікаў пераўзышлі чаканні арганізатараў. Больш чым 20 тысяч суайчыннікаў удзельнічала ў дыскусіі па ўсёй краіне. Людзей цікавяць самыя разнастайныя тэмы — развіццё сям'і, IT-сектара. І, бадай, галоўнае — стварэнне партнёрскіх адносін дзяржавы і грамадзян. Прычым людзі свабодна выказваюць сваё меркаванне па тых ці іншых пытаннях шляхам адкрытага дыялогу, сцэнарый правядзення загадзя не рыхтуецца.

**Намеснік старшыні Мінаблвыканкама Іван МАРКЕВІЧ** адзначыў, што ў цэнтральным рэгіёне праведзена 70 дыялогавых пляцовак. Такія пляцоўкі сапраўды аб'ядноўваюць людзей. Грамадзяне выказваюць ідэі, што затым ажыццяўляюцца, а Мінская вобласць становіцца больш камфортнай і зручнай для жыцця.

> **«Але сёння арэнда яго каштуе дорага, асабліва ў вялікіх гарадах, дзе не прымяняецца паніжальны каэфіцыент. Неабходна падымаць пытанне на ўсіх узроўнях, каб банкі выдавалі крэдыты маладым спецыялістам на будаўніцтва жылля пад 5 % на 20—30 гадоў».**

Удзельнікі прапанавалі праводзіць таксама міжведамасныя дыялогавыя пляцоўкі разам з моладдзю. Вадзім Гігін адзначыў, што неабходна прапаноўваць розны фармат правядзення, каб зацікавіць маладых. Іван Маркевіч выказаўся за тое, каб для апошніх стваралі больш умоў для кар'ернага росту, прапаноўвалі ім адказныя пасады.

**Старшыня савета Мінскай абласной арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Казімір ЧАРАПКОЎСКІ,** яго калегі і наогул людзі старэйшага пакалення заклапочаны праблемай патрыятычнага выхавання насельніцтва ў цэлым і падрастаючых грамадзян у прыватнасці. «За пяцігодку вырасла пакаленне з ніадкуль. Маладыя людзі не разумеюць і не задумваюцца, чаму змяніўся выгляд нашых пасёлкаў, хто для іх пабудаваў новыя аб'екты, жыллё, стварыў для іх дабрабыт. Якой працай і якімі намаганнямі гэта дасталася», — падкрэсліў ён. Казімір Браніслававіч прапанаваў распрацаваць рэспубліканскую праграму па патрыятычным выхаванні моладзі. Вадзім Гігін канстатаваў, што створана група па распрацоўцы такога дакумента на пяцігодку пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталлі Качановай. У гэтую групу ўваходзіць і ён. Вадзім Гігін запрасіў усіх ахвотных уносіць свае прапановы, якія пазней будуць выкарыстаны ў праграме.

**Начальнік аддзела спорту і турызму Маладзечанскага райвыканкама Раман КУЗНЯЦОЎ** распавёў, што ў студзені 2019 года ўпраўленне па адукацыі, спорце і турызме было раздзелена на два ведамствы. Аднак так стала толькі ў буйных гарадах Міншчыны. Раман Кузняцоў пацікавіўся, што плануецца ў гэтых адносінах у іншых раёнах. Дадзенае пытанне прапрацавана са старшынёй Мінаблвыканкама, адзначыў Іван Маркевіч. Магчыма будзе створана дзяржаўнае аб'яднанне або структура, якія будуць займацца спортам і турызмам. Мінская вобласць у гэтым плане павінна стаць базай пілотнага праекта. Больш канкрэтныя дэталі будучай структуры плануецца абмеркаваць. Але адназначна, што сістэму трэба змяняць з улікам новых падыходаў, форм і метадаў работы.

Бурныя рэакцыю і абмеркаванне, сутыкненне розных поглядаў выклікала пытанне дырэктара Барысаўскага дзяржаўнага каледжа Ліліі Чэчы па замацаванні кадраў і забеспячэнні маладых спецыялістаў жыллём.

— Выпускнікі нашага каледжа накіроўваюцца на работу ў дашкольныя ўстановы. Але ўзнікае праблема з забеспячэннем жыллём,— сказала яна.

— Сапраўды, сёння 20 % педагогаў вобласці перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту. Іх павінны замяніць маладыя кадры. І яны прыходзяць у навучальныя ўстановы. Але пытанне іх жыллёвага ўладкавання стаіць на парадку дня, асабліва востра ў Мінскім раёне, дзе актыўна будуюцца школы, дзіцячыя садкі, — падтрымаў Лілію Чэчу **начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінаблвыканкама Мікалай БАШКО.** — Каб вырашыць кадравую праблему, мы запрашаем маладых спецыялістаў з іншых рэгіёнаў вобласці.

На думку Мікалая Мікалаевіча, неабходна развіваць рынак арэнднага жылля так, каб кожны малады спецыяліст змог атрымаць жыллё на месцы работы.

— Арэнднае жыллё — гэта добра, — выказаўся з нагоды Іван Маркевіч. — Але сёння арэнда яго каштуе дорага, асабліва ў вялікіх гарадах, дзе не прымяняецца паніжальны каэфіцыент. Неабходна падымаць пытанне на ўсіх узроўнях, каб банкі выдавалі крэдыты маладым спецыялістам на будаўніцтва жылля пад 5 % на 20—30 гадоў. Моладзь будзе мець сваё жыллё, а значыць, і замацоўвацца.

Акрамя таго, як лічаць некаторыя ўдзельнікі дыялогавай пляцоўкі, маладым варта даваць права прыватызаваць службовае жыллё пасля таго, як яны адпрацавалі, дапусцім, 15 гадоў у арганізацыі, на прадпрыемстве, якія ім яго выдзелілі. У гэтым выпадку яны будуць сачыць за домам, кватэрай, уладкоўваць памяшканне, рабіць рамонт з перспектывай абзавесціся сваім кутком.

Удзельнікі пляцоўкі акцэнтавалі ўвагу і на дэмаграфічнай сітуацыі, рабоце са шматдзетнымі сем'ямі. Так, на Міншчыне пражывае 19 600 шматдзетных сем'яў, дзе выхоўваецца ад трох да адзінаццаці дзяцей. Падчас правядзення дыялогавых пляцовак бацькі казалі, што нарадзілі дзяцей асэнсавана. Але ўдзел у іх выхаванні дзяржавы таксама важны. Яны за тое, каб пашырылі спіс варыянтаў датэрміновага выкарыстання сямейнага капіталу. Сёння ён распаўсюджваецца на тры пазіцыі — паляпшэнне жыллёвых умоў (будаўніцтва, рэканструкцыя або набыццё жылых памяшканняў, пагашэнне запазычанасці па крэдытах), на атрыманне платнай вышэйшай адукацыі і платных медыцынскіх паслуг.

Па словах **старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінаблвыканкама Тамары КРАСОЎСКАЙ,** неабходна думаць не толькі пра шматдзетных. «Мы павінны думаць у цэлым аб сям'і. Мы прапаноўваем, каб сямейны капітал выплачваўся і пры нараджэнні другога дзіцяці», — падкрэсліла Тамара Пятроўна. У полі зроку дзяржавы павінны стаць і няпоўныя сем'і. Пасля разводу малое звычайна застаецца з маці — як правіла, гэта жанчыны ва ўзросце да 30 гадоў. Нарадзіць другое і трэцяе дзіця па-за шлюбам рызыкуюць не ўсе. Пра іх таксама не варта забываць, трэба аказваць дапамогу і падтрымку. Наогул, неабходна ствараць для сям'і дружалюбнае асяроддзе. Наймальнікі не рызыкуюць браць на работу жанчын пасля водпуску па доглядзе за дзецьмі. Мауляў, лішнія праблемы — пастаянныя «бальнічныя». Неабходна распрацоўваць стымулы ў дачыненні да кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый, каб яны больш ахвотна працаўладкоўвалі бацькоў з няпоўных, шматдзетных сем'яў, сем'яў, што выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Не ўсё вымяраецца матэрыяльна. Наогул, трэба ствараць вакол такіх сем'яў атмасферу клопату, увагі.

Тамару Красоўскую падтрымаў Вадзім Гігін: «Адзін з прыярытэтаў у праекце Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады — гэта ўмацаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, фарміраванне здаровай моцнай сям'і, фізічны, маральны і матэрыяльны дабрабыт, выхаванне падрастаючага пакалення, клопат аб старэйшым пакаленні і забеспячэнне актыўнай старасці».

Акрамя таго, абмяркоўвалася далейшае ўдасканаленне сістэмы аховы здароўя, культуры, прафесійнай арыентацыі моладзі. Намеснік старшыні Мінаблвыканкама Іван Маркевіч у канцы размовы падсумаваў, што ўсе агучаныя пытанні будуць прааналізаваны і абагульнены, а практыка правядзення дыялогавых пляцовак прадоўжыцца.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

На карысць

# КАБ ПАДТРЫМАЦЬ ЭКАНОМІКУ

**Меры па падтрымцы галін і арганізацый ва ўмовах замаруджвання эканамічнай актыўнасці ў сувязі з эпідсітуацыяй пачалі дзейнічаць у Беларусі са студзеня.**

Магчымасці, якія мусяць падтрымаць эканоміку краіны, прадугледжаны Указам кіраўніка дзяржавы № 512. У прыватнасці, працягнута магчымасць давання льгот па плацяжах у мясцовыя бюджэты і арэнднай плаце за зямельныя ўчасткі, а таксама мараторый на павелічэнне базавай арэнднай велічыні.

Растэрміноўкі па арэндных плацяжах, якія былі дадзены ў другім і трэцім кварталах 2020-га, перанесены на першае паўгоддзе бягучага года. Магчымы, таксама і новыя растэрміноўкі ў першым паўгоддзі з растэрміноўкай пагашэння абавязацельстваў да канца 2021-га.

Зменамі прадугледжана таксама дапаўненне пераліку відаў эканамічнай дзейнасці, якія найбольш падвергнуты неспрыяльнаму ўздзеянню эпідэміялагічнай сітуацыі.

Наймальнікі атрымалі права аб'яўляць прастой, выкліканы неспрыяльнай эпідсітуацыяй, не абмежаваны па часе на працягу каляндарнага года. Калі такое спыненне работы цягнецца ў агульнай суме больш за паўгода, работнікі арганізацый, якія аб'явілі прастой, могуць датэрмінова разарваць працоўны дагавор (кантракт) у перыяд прастою.

Работадаўцы таксама змогуць даваць работніку (з яго згоды) водпуск для знаходжання ў самаізаляцыі ў месцы, якое вызначана наймальнікам. Працягласць водпуску вызначаецца па пагадненні бакоў працоўнага дагавора. На перыяд водпуску за работнікам захоўваецца заробак у памеры не ніжэй за ўстаноўленую тарыфную стаўку (калі іншае не прадугледжана калектыўным дагаворам ці пагадненнем).

Пры рабоце вахтавым метадам санітарам (санітаркам) і нянькам дзяржустаноў сацабслугоўвання, якія ажыццяўляюць стацыянарнае сацабслугоўванне, наймальнік можа ўстанаўліваць працягласць выконваемай імі работы звыш працягласці рабочага часу па асноўнай рабоце не больш як 900 гадзін у год.

Работадаўцам таксама дадзена магчымасць уключаць у рабочы год, за які даецца працоўны адпачынак, час прадугледжаных заканадаўствам адпачынкаў без захавання заробку, якія даюцца па ініцыятыве наймальніка, без абмежаванняў іх працягласці.

**Ірына СІДАРОК.**

# Жалезнае братэрства

## ШЧЫРАЯ ДРУЖБА

Як расказалі карэспандэнту БелТА ў пасольстве Беларусі ў КНР, мінулы год быў напоўнены падзеямі, што ўмацавалі двухбаковыя адносіны і вывелі іх на больш высокі ўзровень. «Нягледзячы на пандэмію каранавіруса і запаволенне дзелавой актыўнасці ва ўсім свеце, супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з Кітайскай Народнай Рэспублікай развівалася ўсебакова і дынамічна, забяспечана актыўнае падтрыманне беларуска-кітайскіх палітычных, эканамічных, гуманітарных кантактаў», — адзначылі ў пасольстве.

«Беларусь і Кітай актыўна падтрымліваюць адзін аднаго па розных пытаннях на міжнароднай арэне, з'яўляючыся надзейнымі стратэгічнымі партнёрамі», — падкрэслілі ў дыпмісіі. «Рэальным сведчаннем шчырай дружбы і ўзаемадапамогі стала накіраванне гуманітарнай дапамогі адно аднаму ў цяжкія часы барацьбы з COVID-19. Беларусь 30 студзеня і 6 лютага мінулага года (фактычна першая ў свеце. — **Рэд.**) прыйшла на дапамогу Кітаю, накіраваўшы па рашэнні кіраўніка дзяржавы два самалёты з гуманітарным грузам для барацьбы з распаўсюджваннем каранавіруса. А ў красавіку, маі, снежні 2020 года з Кітая ў Беларусь былі дастаўлены сродкі медыцынскага прызначэння, уключаючы дапамогу ад урада, 21 рэгіёна і многіх суб'ектаў гаспадарання КНР», — адзначылі ў пасольстве.

Адметна, што першы Аляксандра Лукашэнку з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах павіншаваў менавіта старшыня КНР Сі Цзіньпін. Паводле яго слоў, Беларусь і Кітай — «жалезныя браты і ўсепагодныя партнёры». «Я надаю вялікае значэнне развіццю кітайска-беларускіх адносін і шаную добрыя рабочыя адносіны і асабістую дружбу з Вамі», — адзначыў у пасланні старшыня КНР.

## ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ДОСТУПУ

У мінулым месяцы Беларусь і КНР стварылі пляцоўку для адпрацоўкі пытанняў доступу на кітайскі рынак. Першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай Снапкоў пракаментаваў вынікі праведзенага ў рэжыме відэаканферэнцыі ў сярэдзіне снежня пасяджэння Беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве, паведамілі ў прэс-службе ўрада. Паводле слоў першага віцэ-прэм'ера, прынятыя ў ходзе пасяджэння рашэнні носяць глыбокі стратэгічны характар, якія раскрываюць патэнцыял двухбаковага ўзаемадзеяння. «Эксклюзіўным з'яўляецца стварэнне ў рамках міжурадавага камітэта Камісіі па мытным і карацінным супрацоўніцтве. Гэта практычная пляцоўка для адпрацоўкі ўсіх пытанняў доступу на рынкі КНР, ветэрынарнага, каранцінная нагляду і лагістычных ланцужкоў», — адзначыў Мікалай Снапкоў.



sb.by

Старшыня кітайскай часткі міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве Го Шэнкунь пацвердзіў прыярытэтнасць і безумоўную якасць рэалізацыі ў Беларусі за кошт тэхніка-эканамічнай дапамогі КНР двух спартыўных аб'ектаў — нацыянальнага футбольнага стадыёна і басейна міжнароднага стандарту. «Бакі абмеркавалі таксама неабходнасць найхутчэйшага прыцягнення ў эканамічны абарот у Беларусі рэшткаў крэдытных ліній КНР у аб'ёме каля $4 млрд на канкрэтныя праекты па развіцці сацыяльнай і транспартнай інфраструктуры ў мэтах няўхільнага павышэння ўзроўню жыцця насельніцтва Беларусі», — адзначылі ў прэс-службе ўрада.

## ДРАЙВЕР РОСТУ

Беларусь разглядае пастаўкі сельгаспрадукцыі ў Кітай як новы драйвер экспарту, заявіў падчас пасяджэння міжурадавага камітэта Мікалай Снапкоў. «У гандлёвым супрацоўніцтве з Кітаем адзначу станоўчую дынаміку, звязаную са зменай структуры беларускага экспарту: пашыраецца таварная наменклатура, зніжаецца залежнасць ад экспарту калійных угнаенняў. Пастаянна павялічваецца аб'ём паставак у Кітай беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі», — сказаў Мікалай Снапкоў. Паводле інфармацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, аб'ём паставак у Паднябесную на працягу студзеня—лістапада мінулага года склаў 238,7 мільёна долараў.

У развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва краін на найбліжэйшую перспектыву першы віцэ-прэм'ер акрэсліў шэраг прыярытэтаў, сярод якіх актыўнае прасоўванне экспарту беларускай прадукцыі ў Кітай, пашырэнне допуску на рынак КНР новых катэгорый беларускай ялавічыны, больш хуткая акрэдытацыя беларускага сухога дзіцячага харчавання, павелічэнне квоты на пастаўку цукру ў Кітай.

У якасці ключавых момантаў разглядаюцца выкарыстанне электронных гандлёвых пляцовак як перспектыўнага механізму двухбаковага гандлю, уключэнне беларускай прадукцыі ў дзяржрэзерв КНР, стварэнне на тэрыторыі Кітая сумесных вытворчасцяў для перапрацоўкі беларускай сыравіны, спрашчэнне гандлёвых працэдур і ліквідацыя гандлёвых бар'ераў, аптымізацыя механізмаў фінансавых разлікаў.

## РЭКОРДНЫ ТАВАРААБАРОТ

«КНР працягвае захоўваць статус трэцяга па велічыні гандлёвага партнёра Беларусі. Згодна з нашай статыстыкай, аб'ём тавараабароту паміж Кітаем і Беларуссю па выніках 2019 года дасягнуў рэкорднага паказчыка, павялічыўшыся на 58 %. Нягледзячы на ўплыў пандэміі і іншых негатыўных сусветных фактараў, са студзеня да канца лістапада 2020 года маштаб двухбаковага гандлю вырас на 9,2 працэнта. Гадавы аб'ём тавараабароту дасягне новага гістарычнага рэкорду», — расказала БелТА саветнік па гандлёва-эканамічных пытаннях пасольства КНР у Беларусі Чжаа Цюянь.

На яе думку, гандаль сельскагаспадарчай прадукцыяй паміж Кітаем і Беларуссю стаў новым яркім момантам двухбаковага абмену таварамі ў новых умовах. Са студзеня да канца лістапада 2020 года аб'ём гандлю сельскагаспадарчай прадукцыяй паміж дзвюма краінамі павялічыўся на 61,6 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам 2019-га. Пры гэтым беларускі экспарт вырас на 83,2 працэнта, а імпарт з Кітая скараціўся на 12,6 %.

Чжаа Цюянь звярнула ўвагу, што Кітайская міжнародная імпартная выстаўка паступова становіцца важнай пляцоўкай для павышэння пазнавальнасці беларускай прадукцыі на кітайскім рынку. Так, у лістападзе мінулага года беларускія прадпрыемствы, якія працуюць у сферах гандлю паслугамі і харчовай прамысловасці, заключылі пагадненні аб намерах куплі тавараў і паслуг на суму больш чым 31 мільён долараў.

«Паміж дзвюма краінамі супрацоўніцтва ў інвестыцыйнай сферы таксама дасягнула добрых вынікаў. Паводле статыстыкі кітайскага боку, са студзеня да лістапада 2020-га аб'ём прамых інвестыцый кітайскіх кампаній у беларускую эканоміку павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам папярэдняга года на 40 працэнтаў», — паведаміла саветнік па гандлёва-эканамічных пытаннях.

## УЗОРНЫ ПРАЕКТ

Адзін з найважнейшых сумесных праектаў — Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», які старшыня КНР ахарактарызаваў як узорны. Як заўважыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой, нягледзячы на складаную сітуацыю, абумоўленую пандэміяй каранавіруса, у мінулым годзе парк працаваў вельмі паспяхова. «Вынікі з'яўляюцца даволі высокімі на фоне нават усёй астатняй эканомікі: $75 млн экспарту, $300 млн ужо асвоеных інвестыцый, практычна тысяча створаных працоўных месцаў, Br2,5 тыс. — сярэдняя заработная плата», — паведаміў Дзмітрый Крутой, перадае БелТА.

«З 68 рэзідэнтаў парка, якія на сёння зарэгістраваныя, 12 адносяцца менавіта да сферы навукі, інавацый, новых, абсалютна ўнікальных распрацовак. Гэта амаль 20 %. Калі б у структуры інвестыцый нашай эканомікі выконвалася такая прапорцыя, я думаю, мы мелі б зусім іншую аддачу і іншую якасць інвестыцыйнага працэсу ў рэспубліцы. Парк ствараўся для рэалізацыі праектаў пераважна пятага і шостага ўкладаў, самых найноўшых распрацовак і інавацый, і ён выконвае сваю місію», — лічыць Дзмітрый Крутой.

## АД АЎТО ДА БІЯТЭХНАЛОГІЙ

«СЗАТ «БелДжы» — прадпрыемства, створанае кітайскай кампаніяй Zhejiang Geely Holding Group, беларускім БелАЗам і іншымі партнёрамі, запоўніць прабел у вытворчасці легкавых аўтамабіляў у Беларусі. Праект добра развіваецца, усяго летась «БелДжы» прадала 23 тысячы аўтамабіляў, з якіх 9,2 тысячы ў Беларусі і каля 15 тысяч — у іншыя краіны», — паведаміла Чжаа Цюянь.

Яна звярнула ўвагу і на тое, што кітайская карпарацыя Midea Group і беларуская кампанія «Гарызонт» стварылі сумеснае прадпрыемства па зборцы бытавой тэхнікі ў свабоднай эканамічнай зоне беларускай сталіцы. Сетка продажаў іх прадукцыі ахоплівае Еўразійскі эканамічны саюз і краіны СНД, частка тавараў таксама прадаецца ў Еўропе. За мінулы год аб'ём рэалізацыі кампаніі склаў $21 млн.

Поўным ходам вядуцца будаўнічыя работы па праекце «Арганізацыя высокатэхналагічнай аграпрамысловай вытворчасці поўнага цыклу», інвестарам і генеральным падрадчыкам якога з'яўляецца кітайская кампанія. «Пасля завяршэння будаўніцтва ён стане першым заводам па вытворчасці амінакіслот у Беларусі. Гэта важны стратэгічны праект у біятэхналагічнай галіне ў Беларусі, увод яго ў эксплуатацыю чакаецца ўжо ў першай палове гэтага года», — падкрэсліла саветнік пасольства КНР.

Чжаа Цюянь таксама распавяла, што Кітай і Беларусь у найбліжэйшы час маюць намер абмяняцца нотамі паміж урадамі для падпісання трэцяга этапу будаўніцтва сацыяльнага жылля ў Беларусі з выкарыстаннем бязвыплатнай дапамогі Кітая. «Будаўніцтва пачнецца ў першай палове гэтага года. 20 дамоў на 1166 кватэр будуць узведзены ў шасці рэгіёнах Беларусі на працягу двух гадоў», — растлумачыла яна. На першых двух этапах рэалізацыі праекта ў шасці абласцях і Мінску было пабудавана 38 дамоў на 3286 кватэр, што дазволіла палепшыць жыллёвыя ўмовы больш чым дзесяці тысячам чалавек.

**Захар БУРАК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Даслоўна**

## Разам супраць пагроз

Днямі адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі са Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпінам

Кіраўнікі дзяржаў абмяняліся віншаваннямі з нагоды чарговай гадавіны ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Кітаем (пад знакам гэтай даты і прайшла размова), падрабязна абмеркавалі розныя сферы супрацоўніцтва, як паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў старшыні КНР за падтрымку Беларусі на міжнароднай арэне. Як адзначыў у дадзеным кантэксце кітайскі лідар, толькі народ можа вырашаць і вызначаць будучыню сваёй краіны. У цэлым жа стратэгічныя партнёры Беларусь і Кітай будуць разам супрацьстаяць знешнім пагрозам. Беларусь таксама працягне аказваць Кітаю падтрымку па ўсіх ключавых пытаннях.

Значная ўвага ў размове была ўдзелена сітуацыі з пандэміяй COVID-19. Бакі абмяняліся інфармацыяй аб мерах па супрацьдзеянні распаўсюджванню інфекцыі, якія прымаюцца. Як адзначыў кітайскі лідар, прычын супакойвацца пакуль няма. КНР пацвердзіла гатоўнасць паставіць у Беларусь вакцыну ад COVID-19 у патрэбным аб'ёме.

Як безумоўна пазітыўны факт Прэзідэнт Беларусі і Старшыня КНР адзначылі рост двухбаковага гандлю. Яны з задавальненнем канстатавалі, што спаду ўдалося не дапусціць нават у складаных умовах пандэміі і зніжэння дзелавой актыўнасці. У якасці прыкладу ў дадзеным выпадку былі прыведзены пастаўкі беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі на кітайскі рынак. Асноўнымі пунктамі росту ў цэлым застаюцца прадукты харчавання і прадукцыя дрэваапрацоўкі. Паспяхова праведзена работа па напаўненні беларускай экспартнай заяўкі, у якую ўвайшлі 88 пазіцый сельскай гаспадаркі, машынабудавання, хімічнай прамысловасці. Таксама лідары абмеркавалі тэму павелічэння аб'ёмаў закупкі КНР у Беларусі калійных угнаенняў. На адпаведную просьбу беларускага боку кітайскія партнёры адказалі гатоўнасцю актыўна прапрацаваць гэтае пытанне.

У цэнтры ўвагі былі і пытанні далейшага развіцця і рэалізацыі патэнцыялу індустрыяльнага парка «Вялікі камень», які з'яўляецца ключавым элементам удзелу Беларусі ў ініцыятыве «Пояс і шлях». Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь традыцыйна будзе дзейным удзельнікам ініцыятывы.

З мэтай развіцця міжрэгіянальнага супрацоўніцтва прапанавана абвясціць Год рэгіёнаў Беларусі і Кітая і правесці яго на працягу трох гадоў, з 2021-га да 2023-га. Прэзідэнт Беларусі і Старшыня КНР абмеркавалі і пытанне найбліжэйшай асабістай сустрэчы. З гэтай нагоды пазіцыі таксама цалкам супадаюць: як толькі крыху палепшыцца сітуацыя з пандэміяй, такая сустрэча для абмеркавання ўсіх пытанняў адбудзецца.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

29 студзеня 2021 г. № 3 (588)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# ВУЧЫЦЦА НА ФАКТАХ ГІСТОРЫІ



Фота БелТА.

## Якія падыходы неабходна выкарыстоўваць для выхавання патрыётаў?

**Аб гэтым вялася гутарка на выязным пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі, якое адбылося на базе Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Першае сёлета пасяджэнне Прэзідыума было прысвечана абмеркаванню актуальнага пытання — фарміраванню грамадзянскасці і патрыятызму студэнцкай моладзі нашай краіны.**

Трэба сказаць, што выбар тэмы абумоўлены роляй моладзі ў лёсе краіны, вызначэнні яе будучыні.

— Сёння на разгляд Прэзідыума Савета Рэспублікі вынесена вельмі актуальная тэма: патрыятычнае выхаванне моладзі і работа па патрыятычным выхаванні ў студэнцкіх аўдыторыях, — акцэнтавала ўвагу ў гутарцы з журналістамі **спікер верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА.** — Мы лічым, што яна павінна абмяркоўвацца на ўсіх узроўнях, таму што яна не можа не хваляваць.

На яе думку, ваенная гісторыя — гэта той фундамент, на якім павінна будавацца патрыятычнае выхаванне моладзі. Кожная ВНУ мае свае праекты, па якіх яны працуюць дастаткова даўно. Неабходна, каб гэтая работа была эфектыўная і выніковая, і галоўнае, каб у ёй не было фармалізму.

Акрамя таго, важным аспектам з'яўляецца і чалавечы патэнцыял, падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. Таму падрыхтоўка, перападрыхтоўка педагагічных кадраў, з яе пункту гледжання, таксама важны кірунак, на які трэба звярнуць асаблівую ўвагу. Установам вышэйшай адукацыі важна не толькі перадаваць сучасныя веды, фарміраваць прафесійныя навыкі, але і звяртаць увагу на асобу маладога чалавека, дапамагаць яму ў самаразвіцці найлепшых грамадскіх і маральных якасцяў, стварэнні асяроддзя для паспяховай сацыялізацыі.

### ГІСТОРЫЯ СУПРАЦЬ ФАЛЬСІФІКАЦЫІ

У пачатку мерапрыемства яго ўдзельнікі пазнаёміліся з інтэрактыўнай тэматычнай выстаўкай, якая датычылася грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі. Напрыклад, **Ганна КАРОЗА, загадчык кафедры архітэктуры Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта,** расказала пра сумесныя з мемарыяльным комплексам «Брэсцкая крэпасць-герой» праекты для студэнцкай моладзі: ад даследчыцкай і навуковай дзейнасці да добраўпарадкавання тэрыторыі мемарыяльнага комплексу. **Уладзімір МОЖАР, студэнт Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках,** азнаёміў з работай музея, які дзейнічае на базе навучальнай установы, яго ўнікальнымі экспанатамі, а таксама новымі формамі работы: квэстамі, 3D-экскурсіямі, турысцка-краязнаўчымі мерапрыемствамі.

**Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА** расказаў на пасяджэнні, як вядзецца сістэмная работа з моладдзю па фарміраванні ў яе грамадзянскасці і патрыятызму.

Па яго словах, работа па патрыятычным выхаванні пранізвае ўсе ўзроўні адукацыі: ад дзіцячага садка да вышэйшай школы. Кожны вучэбны прадмет, кожная дысцыпліна аказвае ўплыў на фарміраванне дзяцей і моладзі, але найбольш істотна, безумоўна, уплываюць сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны, таму сістэмна аддаецца ўвага зместу адукацыйных дысцыплін, якія выкладаюцца на ўсіх ступенях сістэмы адукацыі. Так, на вывучэнне Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў ва ўстановах адукацыі краіны звяртаецца асаблівая ўвага.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

## Пытанні на кантролі кожнага кіраўніка

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА наведаў вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Фрэбар», якое з'яўляецца вытворцам вырабаў медыцынскага прызначэння.**

Віцэ-спікер Савета Рэспублікі азнаёміўся з вытворчай базай прадпрыемства, асартыментам выпускаемай прадукцыі, а таксама пагутарыў з прадстаўнікамі працоўнага калектыву, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

— Галоўнай задачай для кіраўніцтва любога прадпрыемства з'яўляецца стварэнне камфортных рабочых умоў і належнага ўзроўню аплаты працы. Сёння мы павінны думаць пра кожнага работніка і трымаць усе пытанні, якія хвалююць працоўны калектыў, на пастаянным кантролі, — адзначыў намеснік старшыні Савета Рэспублікі.

## Аб будучым форуме і наступствах «каляровых рэвалюцый»

### Гаворка зайшла падчас наведвання сенатарам сталічнага завода

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ наведаў ААТ «Агат — электрамеханічны завод» і сустрэўся з яго працоўным калектывам.**



sovrep.gov.by

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента, сенатар азнаёміўся з вытворчым працэсам і яго вынікамі, наменклатурай выпускаемай прадукцыі, станам і перспектывамі павелічэння яе экспарту, пацікавіўся ўмовамі працы, заработнай платай, тэмай сацыяльнага развіцця прадпрыемства.

Падчас размовы з прадстаўнікамі працоўнага калектыву Сяргей Рачкоў расказаў аб дзейнасці Савета Рэспублікі, прынятых падчас восеньскай сесіі законапраектах, іх арыентаванасці на рашэнне ўнутрыэканамічных задач, пашырэнне міжнароднага супрацоўніцтва з акцэнтам на павелічэнне экспарту беларускіх тавараў і паслуг.

Парламентарый падрабязна расказаў аб рабоце сенатараў са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, праведзенні імі асабістых прыёмаў (у тым ліку выязных) і прамых ліній.

Старшыня Пастаяннай камісіі асобна спыніўся на пытаннях, звязаных з VI Усебеларускім народным сходам. Ён адзначыў важнасць форуму для абмеркавання праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады і вызначэння кірунку ўдасканалення палітычнай сістэмы краіны.

Сенатар таксама падзяліўся сваёй ацэнкай сучаснай грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне, меркаваннем аб практыцы выбараў прэзідэнта ЗША на падставе свайго неадназовага ўдзелу ў міжнародным назіранні за выбарамі кіраўніка амерыканскай дзяржавы і растлумачыў, якімі бываюць разбуральныя наступствы «каляровых рэвалюцый» у краінах, у якіх ён працаваў надзвычайным і паўнамоцным паслом.

РАБОТА Ў РЭГІЁНЕ

## ЦІ ЧАКАЕ РАЁН РАСФАРМІРАВАННЕ?

### Такое пытанне прагучала на Зэльвеншчыне падчас прамой лініі сенатара

**Яе праводзіў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ. У гэты дзень ён таксама правёў у райцэнтры асабісты прыём грамадзян, прыняў удзел у пасяджэнні райвыканкама і ў межах «Школы актыўнага грамадзяніна. ШАГ» пагутарыў з моладдзю.**

На асабісты прыём да сенатара прыйшла жыхарка райцэнтра Алена Коўш, якая падзякавала сенатару за садзейнічанне ў эндапратэзаванні ў адной з клінік абласнога цэнтра. Яна паведаміла, што спецыялісты аказалі ёй прафесійную дапамогу на найвышэйшым узроўні. Акрамя таго, жанчына прасіла парламентарыя дапамагчы ў вырашэнні асабістай праблемы.

На прамую лінію патэлефанаваў мясцовы жыхар, які пацікавіўся будучым Зельвенскага раёна: маўляў, ці чакае яго расфарміраванне?

— Хвалявацца не трэба. Прэзідэнт дакладна сказаў, што ніякага тэрытарыяльнага перадзелу на Гродзеншчыне не будзе. Нават сельсаветы ва ўсіх раёнах у найбліжэйшай будучыні захаваюць свае ранейшыя межы, — прыводзіць словы старшыні Пастаяннай камісіі раённая газета «Праца».

Што датычыцца пасяджэння райвыканкама, прысутныя на ім абмеркавалі рэалізацыю Дырэктывы № 2 «Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва».

А на сустрэчы з моладдзю ў рамках праекта «ШАГ» адбыўся сапраўдны дыялог пакаленняў. Напярэдадні Дня беларускай навукі старшыня профільнай камісіі абмяркоўваў з гімназістамі тэму навуковых рэалій нашай краіны і будучых перспектыў.

Дарэчы, Віктар Ліскові мае непасрэднае дачыненне да навуковай дзейнасці: ён уладальнік чатырох патэнтаў на вынаходніцтвы, з'яўляецца аўтарам больш чым 350 навуковых работ і публікацый.

Навучэнцы, са свайго боку, не маглі не азнаёміць госця са школьным праектам «ZNOVA», які дае магчымасць ствараць біяраскладальную паперу з трыснягу.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

НА СЛЫХУ

## Што будзе з цэнамі на лекі?

### Гэтым пытаннем задаюцца многія, асабліва людзі сталага веку

**Вядома, што ў сувязі са зменамі ў Падатковы кодэкс, якія пачалі дзейнічаць з 1 студзеня, фарміраванне цэн на лекавыя сродкі і медыцынскія вырабы зараз знаходзіцца пад пільнай увагай.**

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** прыняла ўдзел у адной з рабочых нарад, якая праводзілася Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю і Міністэрствам аховы здароўя. Нарада прайшла ў рэжыме відэа-канферэнц-сувязі з удзелам РУП «Белфармацыя», паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

Удзельнікамі нарады абмяркоўвалася праблема як нівеліраваць магчымы ўплыў росту ставак ПДВ на цэны лекаў.

Сенатар падкрэсліла, што задача, якая была пастаўлена кіраўніком дзяржавы, — рост цэн за год не павінен перавышаць 4,9 %, павінна быць выканана. Асаблівая роля ў гэтым працэсе адводзіцца айчынным вытворцам лекавых прэпаратаў, якім неабходна працаваць над зніжэннем выдаткаў па выпуску гатовай прадукцыі.

— Члены Савета Рэспублікі гатовыя актыўна падключыцца да маніторынгу цэнавай сітуацыі на рынку лекавых сродкаў і зрабіць свой унёсак для дасягнення пастаўленай мэты, — звярнула ўвагу старшыня профільнай камісіі.

Належны кантроль з боку сенатарскага корпуса будзе забяспечаны.

# ВУЧЫЦЦА НА ФАКТАХ ГІСТОРЫІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

— Сёння мы сутыкаемся са спробамі перапісаць гісторыю ў кан'юнктурных палітычных мэтах, абясцэніць унёсак беларускага народа ў сусветную перамогу над фашызмам, — адзначыў міністр. — Менавіта гістарычная навука выступае асновай супрацьстаяння фальсіфікацыі.



> Неабходна больш актыўна сустракацца з моладдзю, каб пераканаўча (у лічбах і фактах) тлумачыць тое, што адбываецца.

Таму для ўстаноў вышэйшай адукацыі распрацавалі праект новай мадэлі цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, якая ўключае ў сябе дысцыпліну «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці».

Між іншым, на выстаўцы быў таксама прадстаўлены праект «Гонар за Беларусь», які атрымаў прэмію «За Духоўнае адраджэнне», аднайменны вучэбны дапаможнік і матэрыялы ўжо выкарыстоўваюцца ва ўстановах агульнай сярэдняй, а таксама вышэйшай тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

— Гэты праект будзе працягнуты, — запэўніў Ігар Карпенка. — Мы амаль завяршылі стварэнне другой кнігі, якая выйдзе ў найбліжэйшы час. Ёсць дамова з лінгвістычным універсітэтам аб яе перакладзе на замежныя мовы для выкарыстання ў рабоце беларускіх пасольстваў на тэрыторыі іншых краін. Каб грамадзяне маглі бачыць дасягненні нашай краіны, а не толькі арыентавацца на дэструктыўныя тэлеграм-каналы.

### ТРЭБА ПАМЯТАЦЬ

На пасяджэнні адзначалася, што асновай фарміравання патрыятызму беларускай моладзі з'яўляецца захаванне памяці аб подзвігу абаронцаў Радзімы падчас Вялікай Айчыннай вайны. Міністр адукацыі пацвердзіў, што ў апошнія гады вялікую практычную значнасць атрымлівае навукова-даследчыцкая дзейнасць навучэнцаў і студэнтаў па тэматыцы патрыятычна кірунку, у тым ліку тэматыка Вялікай Айчыннай вайны.

Дзякуючы сумеснай рабоце БРСМ з дзяржаўнымі органамі і прадпрыемствамі студатрадаўскі рух у нашай краіне выйшаў на якасна новы ўзровень. Занятасць моладзі ў вольны ад вучобы час, яе ўдзел у будаўніцтве знакавых аб'ектаў фарміруе дачыненне да рэалізацыі важных для ўсіх беларусаў праектаў, дазваляе атрымаць першыя працоўныя навыкі, зрабіць асэнсаваны выбар будучай прафесіі.



**Ганна КАРОЗА, загадчык кафедры архітэктуры Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта расказала пра сумесныя з мемарыяльным комплексам «Брэсцкая крэпасць-герой» праекты для студэнцкай моладзі.**

Падчас пасяджэння ўдзельнікі пераканаліся ў тым, што студэнцкае самакіраванне, якое сёння існуе, з'яўляецца ўніверсальным механізмам развіцця ў студэнтаў самастойнасці, атрымання імі першасных арганізацыйных і кіраўніцкіх навыкаў, а таксама выступае эфектыўным сродкам фарміравання грамадзянска-патрытычных якасцяў.

### СУСТРЭЧЫ І АСВЕТНІЦКІЯ ПРАЕКТЫ

Па выніках абмеркавання праблем грамадзянскага і патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі Прэзідыумам Савета Рэспублікі выпрацаваны комплекс практычных рэкамендацый і парад.

— Я наогул лічу — нішто не заменіць жывых стасункаў, — перакананна Наталля Качанава. — Гэта вельмі важна: колькі б мы ні глядзелі тэлебачанне, ні чыталі газет, ні глядзелі электронныя месенджары рознага кшталту, чаты, тэлеграм-каналы, але калі ты маеш стасункі з людзьмі непасрэдна — гэта вельмі важна.

З гэтай мэтай члены Савета Рэспублікі наведваюць працоўныя калектывы, удзельнічаюць у рабоце дыялогавых пляцовак і кожны тыдзень вынікі гэтай работы аналізуюцца, у тым ліку і пытанні, якія зараз хвалююць людзей. Цяпер неабходна больш актыўна сустракацца з моладдзю, каб пераканаўча (у лічбах і фактах) тлумачыць тое, што адбываецца.

Міністэрству адукацыі таксама даручана фарміраваць у маладзёжным асяроддзі прававую і гістарычную культуру, навыкі ацэнкі грамадска-палітычных падзей у нашай краіне і замежных дзяржавах. Для грамадзянска-патрыятычнага выхавання выкарыстоўваць сучасныя інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі.

> Сёння на разгляд Прэзідыума Савета Рэспублікі вынесена вельмі актуальная тэма: патрыятычнае выхаванне моладзі і работа па патрыятычным выхаванні ў студэнцкіх аўдыторыях. Мы лічым, што яна павінна абмяркоўвацца на ўсіх узроўнях, таму што яна не можа не хваляваць.

У рашэнні падкрэслена, што навукоўцам і даследчыкам неабходна актуалізаваць метадычныя рэкамендацыі па сістэме фарміравання і развіцця грамадзяніна з культурна-гістарычнага, духоўнага, ідэалагічнага і іншых кампанентаў.

Таксама прапанавана рэалізоўваць у студэнцкім асяроддзі асветніцкія праекты аб дасягненнях Беларусі, яе выдатных асобах і значных падзеях. Міністэрству культуры неабходна перагледзець падыходы музеяў да работы з маладзёжнай аўдыторыяй.

На пасяджэнні падкрэслена, што рашэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі накіруюць у зацікаўленыя арганізацыі. Савет Рэспублікі будзе кантраляваць іх рэалізацыю.



**Вольга АНУФРЫЕВА.**
**Фота БелТА.**

Тэлесеткі

# ПАЧУЦЬ АЛЬТЭРНАТЫЎНАЕ МЕРКАВАННЕ

**Кожны дзень інфамацыйна-аналітычныя і грамадска-палітычныя праекты Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі прапаноўваюць аўдыторыі сарыентавацца ў плыні навін. А з нядаўняга часу тут прапісаліся і новыя фарматы, і праграмы.**




Аналіз падзей, фактаў, глабальных працэсаў, геапалітычных механізмаў — усё гэта знаходзіць адлюстраванне ў праектах «Панарама», «Галоўны эфір», «Клуб рэдактараў», «Зразумелая палітыка» і шэрагу іншых. У фармаце інфармацыйнага блога, прыкладам якога з'яўляецца аўтарская аналітычная рубрыка журналісткі АТН Марыі Пятрашкі, аўдыторыі прапаноўваюць асабістую пазіцыю журналіста, яго погляд на падзеі. А потым ужо няхай гледачы самі робяць канчатковыя высновы.

Гэтая рубрыка да нядаўняга часу выходзіла ў рамках «Панарамы» (дзе і працягвае існаваць), але цяпер атрымала працяг у выглядзе вячэрняй праграмы «Паспець да апоўначы». У ёй Марыя Пятрашка разам са спецыялістамі абмяркоўвае геапалітычныя хітрыкі, механізмы каляровых рэвалюцый і іншыя актуальныя тэмы, якія апошнія месяцы цікавяць амаль усіх.

Яшчэ штодзённа афіцыйны telegram-канал ATN_NEWS у рэжыме рэальнага часу публікуе актуальныя навіны, фота- і відэасюжэты, анонсы эфірных падзей і прэм'ер і дзеліцца са сваімі падпісчыкамі самымі цікавымі і дакладнымі публікацыямі беларускай тэлеграм-супольнасці. Глядзіце, рабіце высновы і выбірайце сваю крыніцу інфармацыі.

**Алена ДРАПКО.**

# ШАШКІ

**(«Звязда») Выпуск № 132**

Міжнародныя федэрацыі IDF і FMJD адкавілі сусветныя рэйтынгі па стане на 1 студзеня 2021 года.

У шашках-64 другі год запар мужчынскі рэйтынг узначальвае Андрэй Валюк. Дзеючы чэмпіён свету і Еўропы Ігар Міхальчанка — на другім месцы. У жаночым рэйтынгу на трэцім радку Вера Хвашчынская, Яна Якубовіч — пятая, Дар'я Федаровіч — восьмая.

У першай дзясятцы мужчынскага рэйтынгу ў шашках-100 Анатоль Гантварг, ён сёмы. Вольга Федаровіч і Дар'я Федаровіч — на шостым і дзясятым радках жаночага рэйтынг-ліста адпаведна.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі прыбалтыйскіх шашачных кампазітараў. № 9—11 даслаў Генадзь Андрэеў *(Латвія)* № 12,13 — Валдас Беляўскас *(Літва)*.

**№ 9**



**Белыя простыя шашкі:** b6, c7, d6, e1, e7, f6, h4 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, a7, b4, d8, e3, f4, f8, g5 (8)

**№ 10**

**Белыя простыя шашкі:** a5, a7, b6, d2, g5, h6 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, b8, c5, d4, d8, e5 (6)

**№ 11**

**Белыя простыя шашкі:** 12.22.27.31.38.42.43...(7)

**Чорныя простыя шашкі:** 16.19.21.25.29.36.37.40...(8)

№ 12

**Белыя простыя шашкі:** 27, 30, 18, 19, 11, 13, 9 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** 44, 33, 35, 24, 6, 4 (6)

**№ 13**

**Белыя простыя шашкі:** 42, 30, 21, 22, 23, 24, 17 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** 41, 44, 33, 35, 26, 6, 8 (7)

Яшчэ некалькі кампазіцый складзеныя вядучым адзела па правілах бразільскіх шашак

**№ 14**

**Белыя простыя шашкі:** e3, g3, b4, a5, c5, d6, h6 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** b2, a3, h4, g7, d8, f8 (6)

**№ 15**

**Белыя простыя шашкі:** b2, e3, g3, b4, d4, e5 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** c7, e7, b8, f8, Чорныя дамкі h2 (5)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 131 ад 15 студзеня 2021 года.

№ 2 e3,f2,e3,b8,b8:f4:a3(g7) b2(h6)c3(g5)d2(h4)e1(b4,g3) b6(h2)g1+

№ 3 e7, d8,a5,e1,c3 +

№ 4 1.a1-b2 a3:c1 2.g5-h6 c1:g5 3.h4:d8 h2:f4 4.d8-f6 e5:g7 5.h6:f8 d6-e5 6.f8-g7 e5-d4 7.g7:c3 f4-e3 [ 7...f4-g3 8.c3-d4 g3-f2 9.d4:g1 ] 8.c3-e1+

№ 5 1.e3-f4 c5:g5 2.h4:h8 c3:a1 3.e5-f6 a1:g7 4.h8:c7 d8:b6 won 5.e1-d2 b6-c5 6.d2-c3 +

№ 6 1.e3-f4 c5:g5 2.h4:h8 c3:a1 3.g1:e3 a1:f6 4.h8:c7 d8:b6 5.e3-d4 b6-a5 6.d4-c5 a5-b4 7.c5:a3 +

№ 7 1.e3-f4 c5:g5 2.h4:d8 c3:a1 3.e5-d6 c7:e5 4.d8:h8+

№ 8 1.e3-d4 a3:g5 2.h2:f8 c5:e3 3.e5-f6 e7:g5 4.f8:f2 b6-a5 5.f2-h4 g5-f4 6.h4-e7+

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін *(Ашмяны)*, В. Таўкачоў *(в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці)*, В. Дударэвіч *(в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці)*, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі *(усе — Мінск)*, Ф. Карпей, Л. Жыхар *(абодва — Мядзел)*, У. Панько *(Камянец)*, І. Ананіч *(Гродна)*, В. Ваўчкоў *(Маладзечна)*.

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, Мінск. E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**



Сядзі і глядзі

# Героі кніг на экране

**Пісьменнік, публіцыст, драматург, сцэнарыст, рэдактар, літаратурны крытык — у гэтых творчых іпастасях рэалізоўваў сябе Іван Шамякін. Яго кнігі «Крыніцы», «Трывожнае шчасце», «Сэрца на далоні», «Снежныя зімы» і многія іншыя даюць чытачу магчымасць убачыць і зразумець лёс беларускага народа ў XX стагоддзі. Сёлета класік адзначыў бы 100-гадовы юбілей. І якраз у яго дзень нараджэння, 30 студзеня, на сацыякультурным канале зможам убачыць ваенную драму «Вазьму твой боль», якая з'яўляецца экранізацыяй аднайменнага рамана пісьменніка.**





Зняў кінастужку рэжысёр Міхаіл Пташук у 1980 годзе, а летась кінафільму споўнілася ўжо 40 гадоў. Хто глядзеў фільм, той згадае выканаўцаў галоўных герояў, сярод якіх Уладзімір Гасцюхін, Стэфанія Станюта, Галіна Яцкіна, Ірына Малышава, Аляксандр Чарэднік і многія іншыя. Трэба адзначыць, сам пісьменнік умеў быць аб'ектыўным і ацэньваць ігру акцёраў у фільмах паводле сваіх твораў. І ў выпадку з роллю Івана Батрака, якую на экране ўвасобіў Уладзімір Гасцюхін, класік адзначаў, што менавіта такім і стаў бачыць свой персанаж, хоць першапачаткова ўяўленне пра яго было іншае. Што ж да сюжэту, то там гледачы разам з дзеючымі асобамі аказваюцца ў эпіцэнтры гісторыі, калі ў вёску пасля доўгага пазбаўлення волі вяртаецца былы паліцай Рыгор Шышковіч, які быў прызнаны вінаватым у смерці маці і сястры саўгаснага кіроўцы Івана Батрака. За службу ў паліцаі здраднік адбыў доўгі тэрмін у турме, але застаўся жыць, таму што яго віну ў расстрэле даказаць не змаглі. Сустрэча з Шышковічам заставіла Івана зноў перажыць падзеі той жахлівай восені, калі ён, схаваўшыся пад печчу, бачыў, як паліцаі расстрэльвалі яго родных. З таго моманту жыццё Івана ператвараецца ў кашмар. Хоць некаторыя з вяскоўцаў і лічаць, што Шышковіч ужо атрымаў па заслугах, але Батрак не верыць у гэта — і аказваецца, што нядарэмна...

Як сам літаратурны твор, так і фільм у свой час выклікалі шэраг спрэчак сярод аўдыторыі. На вялікім экране шырокая публіка ўпершыню ўбачыла яго 3 лютага 1981 года. Здымкі кінастужкі праходзілі на радзіме Міхаіла Пташука ў Ляхавіцкім раёне, дзе з'явіліся на свет многія фільмы рэжысёра карціны. У працэсе работы не абышлося і без надзвычайных здарэнняў. Так, Уладзімір Гасцюхін згадваў, як у эпізодзе, дзе ён кіраваў камбайнам, раптам выявілася, што машыну не ўдаецца спыніць... На шчасце, усё абышлося, ніхто не пацярпеў. Як і падчас пажару ў доме, з якога даваўся ратаваць акцёра Барыса Пятруніна, які іграў ролю Івана Батрака ў дзяцінстве. Калі казаць пра акцёрскі склад, то ў гэтым фільме ён сапраўды ўдалы. Выканаўца ролі Рыгора Шышковіча акцёр Іван Мацкевіч увасабляў свайго персанажа як у маладым, так і ў сталым узросце, але ў абодвух выпадках аднолькава пераканаўча, настолькі, што аўдыторыя неўзлюбіла экраннага героя... А вось у ролі маці маленькага Івана першапачатковa бачылі актрысу Любоў Палішчук, але ў выніку вобраз валявой жанчыны дастаўся Любові Віралайнен.

У аснову рамана і экранізацыі паклaдзены падзеі рэальнага жыцця, але ход іх і развіццё творцы неаднойчы пэўным чынам карэкціравалі ў працэсе. Так, напрыклад, фінал твора Іван Шамякін некалькі разоў перапісваў. Між тым, фільм «Вазьму твой боль» быў тады не першай экранізацыяй напісанага пісьменнікам, бо знялі ўжо «Хлеб пахне порахам», «Сэрца на далоні», «Крыніцы», «Гандлярка і паэт» і іншыя кінаверсіі яго літаратурных работ. Стваральнікаў гэтага фільма ўзнагародзілі Дзяржаўнай літаратурнай прэміяй БССР, адзначыўшы такім чынам аўтара сцэнарыя Івана Шамякіна, рэжысёра Міхаіла Пташука, кампазітара Сяргея Картэса, акцёра Уладзіміра Гасцюхіна, аператара Віталія Нікалаева, мастака Юрыя Альбіцкага.

І сёння гэты кінатвор — як і яго літаратурная версія — сталі сапраўднай класікай нашай беларускай культуры. Не прапусціце кінапаказ 30 студзеня на тэлеканале «Беларусь 3».



**Алена ДРАПКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.15** Навіны надвор'я.
**10.40, 12.10 Меладрама «Выбар маці» (16+).**
**13.05, 15.25 Серыял «Смяротны трэнінг». 1—4-я серыі (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.05** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**18.35, 19.20 Меладрама «Выбар маці» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**23.45** Арэна.
**0.30** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 19.35** Тэлебарометр.
**9.05** «Панаехалі. Канікулы усляпую» (16+) [СЦ].
**10.00** Камень, нажніцы, папера (16+).
**10.35** «На тыдзень» (16+).
**11.20** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**12.15 Фантастыка-прыгодніцкі экшн «Тор» (12+).**
**14.05** «Каралі палат» (16+).
**14.35** М/с «У госці да Робінсанаў» (12+).
**16.05** М/с «Пінгвіны з Мадагаскара» (0+).
**17.00** «Суперлато».
**17.40** «Мяняю жонку» (16+).
**20.05** «Сямейныя гісторыі» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15** «Тата папаў» (16+).
**23.00** Хачу ў тэлевізар!
**23.05 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабранаранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Лянуха і бульбяныя клёцкі.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.20** Навіны культуры.
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.20** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**9.45, 18.05 «Бумбараш». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.20** «Беларуская кухня». Капуснік.
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.15, 21.05** «Апошні дзень». Арчыл Гаміяшвілі (12+).
**13.55, 21.40 «Вечны ключ». Серыял (12+) [СЦ].**
**15.05** «Навукаманія» (6+).
**15.30** «Беатрычэ. Дантэ» М/ф (6+).
**15.45** «Чартапалох». М/ф (16+).
**16.00** «Спатканне сяброў». Канцэрт з удзелам беларускіх і польскіх фальклорных калектываў.
**17.15** «Кадры жыцця».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.55** «Нататкі на палях». Ян Чачот: дабрадзейны паэт-песеннік [СЦ].

## Беларусь 5

**6.30** Тэніс. WTA. Мельбурн.
**14.30** Вынікі тыдня.
**15.15** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Матч за 3-е месца.
**16.55, 21.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі.
**18.55, 22.40** Спорт-цэнтр.
**19.05** Фрыстайл. Лыжная акрабатыка. Кубак свету. Раўбічы. Сінхронныя скачкі. Фіналы.
**20.15** На грані фолу. Футбольны агляд.
**22.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.00** Нашы навіны.
**9.10** Контуры.
**10.05** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 23.10 Серыял «Біццё сэрца» (16+).
**15.10** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «Шпік». Новы сезон (12+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**10.40** «Таямніцы Беларусі».
**11.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.35, 21.00** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.15** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.45** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.40, 16.50 «Меч». Серыял (16+).**
**20.30, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45** «Міншчына».
**22.00** «Глядзець усім!» (16+)
**0.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.55** «Самая карысная праграма» (16+).
**1.45** «Мінтранс» (16+).

## МІР

**5.00, 10.10 Серыял «Жыць спачатку» [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00,16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 17.15, 2.00** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 2.50** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15 Прэм'ера. Міравое пагадненне (16+).**
**18.00, 19.25 Серыял «Чужы раён-3» [СЦ] (16+).**
**21.40** «Гульня ў кіно» (12+).
**22.25** Шоу «Назад у будучыню» (12+).
**23.25** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**0.15 Маст. фільм «Ельцын. Тры дні ў жніўні». Да 90-годдзя Барыса Ельцына (16+).**
**2.45 Серыял «Лінія Марты» (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Таямніцы Беларусі» (16+).
**12.30** «Спецыяльны рэпартаж».
**12.50** «У людзях».
**13.35** «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Марозава» (12+).**
**17.15** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Скліфасоўскі» (16+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.15** Спорт-мікс.
**6.25** Беларусы (6+).
**7.05** «Здароўе» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.25** Зламаць стэрэатыпы (12+).
**8.45, 10.25, 13.45 Драма «Ваўчынае сонца» (16+).**
**13.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.30** «Зразумець і абясшкодзіць».
**15.00** «Чакай мяне» (12+).
**16.20, 19.40, 22.00, 23.20** Сёння. Галоўнае.
**16.25** Гісторыі збаўлення (12+).
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.00 Серыял «Добрая жонка» (16+).**
**19.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**21.00, 22.20 Серыял «Чужая згрnative» (12+).**
**22.05** «НЗ.by».
**23.35** «Справа ўрачоў» (16+).

## 8 канал

**7.00 15.50, 18.45, 21.05, 0.40** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.00** М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (6+).
**7.30, 15.55, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).**
**8.00, 19.50 Серыял «Хованкі» (16+).**
**8.50** М/ф «Кунгфу панда».
**10.25 Драма «Аднойчы ў Амерыцы» (16+).**
**14.35 Серыял «Неўтаймоўны валадар» (16+).**
**15.20** «Водары кантонскай кухні» (12+).
**17.00 Серыял «Нішто не здараецца двойчы» (16+).**
**18.50 Серыял «Ход каралевы» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.10 Трылер «Чалавек-невідзімка» (18+).**
**23.10 Прыгоды «Ледзяныя дрыжыкі» (12+).**



## ВТВ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.35** «Раніца з гумарам» (16+).
**9.25, 17.00** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**10.00** «Міша псуе ўсё» (16+).
**11.00** «Шоу выхаднога дня» (16+).
**12.00** «Наш рамонт» (16+).
**12.40** Фантастыка «Чалавек-павук: вяртанне дадому» (12+).



**15.05** Серыял «Філатаў» (16+).
**17.35** Трылер «Унутры сябе» (16+).
**19.30** «Поўны блэкаўт» (16+).
**21.05, 1.15** «Уральскія пельмені». Дзень сырка (16+).
**22.30** «Стэндап андэграўнд» (16+).
**23.35** «Зала чакання» (16+).
**0.25** «Кіно ў дэталях» (16+).
**2.05** «Проста кухня» (16+).
**3.45** «Даеш моладзь» (16+).
**4.50** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Люстэрка», «Мех яблыкаў», «Дзюймовачка». Мультфільмы.
**7.35** «Вылет затрымліваецца». Маст. фільм [СЦ].
**8.50** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**9.20** «Мы — грамацеі!»
**10.05** «Сірэна з «Місісіпі». Маст. фільм.
**12.05** Лісты з правінцыі. Гарадзец (Ніжагародская вобласць) [СЦ].
**12.30, 1.30** Дыялогі пра жывёл. Сафары-парк у Геленджыку [СЦ].
**13.10** «Іншыя Раманавы». «Тэорыя разумнага эгаізму» [СЦ].
**13.40** «Гульня ў бісер».
**14.20** Да 100-годдзя з дня нараджэння Сямёна Райтбурта. «Матэматык і чорт», «Што такое тэорыя адносінасці?», «Гэты правы, левы свет». Дак. фільмы.
**15.25, 23.55** Ілюзіён. «Вясёлае жыццё». Маст. фільм.
**17.05** «Забытае рамяство». Дак. серыял. «Пракальшчыца».
**17.20** «Пешшу...» Архангельскае. [СЦ].
**17.50** «Вылячэнне храма». Дак. фільм [СЦ].
**18.35** «Рамантыка раманса». Міхаілу Ісакоўскаму прысвячаецца.
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** «Станцыйны наглядчык». Маст. фільм [СЦ].
**21.15** Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра. Опера Р. Вагнера «Золата Рэйна». Пастаноўка Каралеўскага опернага тэатра Мадрыда і Кёльнскай оперы. 2019 год.
**2.10** Шукальнікі. «Прывіды «Шатуры».

## Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» Год 1992-і (16+).
**7.00, 9.40, 11.00, 13.00, 14.45, 17.20, 0.55, 3.40**. Музычная настальгія (12+).
**7.15, 1.20** Маст. фільм «Вязень замка Іф» (16+).
**8.50** М/ф «Трам! Добры дзень!» (6+)
**9.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**11.10** Дак. фільм «Дзеці XX з'езда» (12+).
**12.00** Маст. фільм «Дзівак-чалавек» (12+).
**13.15** «Вакол смеху». 1990 год. (12+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00** «Праграма А». 1990 год (12+).
**18.00** Фільм-спектакль «Вялікая магія» (12+).
**20.25** «Сумаваць не трэба». Фільм-канцэрт (12+).
**21.40** Маст. фільм «Сын» (16+).
**0.00** «Яловая субмарына». «Гісторыя рускага рока». «Акварыум. Мы ніколі не станем старэйшымі» (16+).
**2.25** «Ранішняя пошта». 1989 год (12+).
**4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**5.20** «Рок-н-рол ТБ» (16+).

## EuroSport 1

**2.05** Горныя лыжы. Кубак свету.
**3.30, 8.00, 19.20** Тэніс. АТР 250.
**5.00, 9.30, 20.45** Снукер. Shoot-Out.
**7.00, 18.15** Веласпорт. «Вуэльта Валенсіі».
**10.30, 13.20** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**12.30, 15.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**14.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету.

## Кінакамедыя

**1.20, 19.30** Як я стаў рускім (16+).
**3.50** Зводныя браты (18+).
**5.35** Дзюплекс (12+).
**7.15** Развод па-французску (16+).
**8.45** Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі (16+).
**10.40** Манашкі на ўцёках (16+).
**12.30** Апошнія дзяўчыны (16+).
**14.10** Фанфан-Цюльпан (12+).
**16.00** Круты і цыбачкі (12+).
**17.50** Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу (16+).
**21.15** Пацучыныя скачкі (12+).
**23.20** Цудоўная (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.20** «Улегцы» (12+).
**8.50** «Бальная сукенка». Маст. фільм (12+).
**10.20, 22.20** «Глядзі сам» (16+).
**10.35** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
**11.25, 2.00** Серыял «Сіндром Дракона» (16+).
**15.50** «Элвін і бурундукі-4». Анімацыйны фільм (6+).
**17.30** Серыял «Жанчына без пачуцця гумару» (12+).
**21.15** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**22.35** «Фарсаж». Маст. фільм (16+).
**0.30** «Грым». Серыял (16+).
**5.35** «Асцярожна, ашуканцы!» (16+)

## ТБ1000

**5.10, 15.10** Паляўнічыя на прывідаў-2 (12+).
**7.15** Век Адалін (16+).
**9.30** Дзяўчына з Джэрсі (16+).
**11.20** Чужы білет (12+).
**13.15** Паляўнічыя на прывідаў (12+).



**17.05** Затура: касмічная прыгода (12+).
**19.00** Зялёны Шэршань (12+).
**21.05** Прывідны патруль (12+).
**22.50** Ультрафіялет (16+).
**0.20** Як адчапіцца ад хлопца за 10 дзён (12+).
**2.15** Сэрцаед (16+).
**3.55** Двое: я і мой цень (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Аднакласнікі.ru: НаCLICKай удачу (12+).
**7.35** Дзяўчаты бываюць розныя (16+).
**9.35** 30 спатканняў (16+).
**11.20** Лаві момант (16+).
**12.45** Уцёкі (16+).
**15.00** Географ глобус прапіў (16+).
**17.15** Пікавая дама: чорны абрад (16+).
**19.00** Пікавая дама: залюстроўе (16+).
**20.30** Світанак (16+).
**22.10** Прайгранае месца (16+).
**0.00** Любі іх усіх (18+).
**1.45** Бабло (16+).
**3.25** Географ глобус прапіў (16+).

## National Geographic

**6.00, 3.30** Аўта-SOS (16+).
**7.30** Фабрыка ежы (16+).
**8.20** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**9.10** Кітай з вышыні птушынага палёту (16+).
**10.05** Гісторыя ежы (16+).
**11.45** Пачатак (16+).
**12.35** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**14.20** Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія і Перу (16+).
**16.00** Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
**17.40** Мяжа (16+).
**19.15** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**22.40** Панарама 360°. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
**23.35** Дзікія жывёлы Поўначы (16+).
**0.25** Будзе шторм (16+).
**2.00** Асушыць акіян: глыбокае апусканне (16+).
**4.15** Невядомая планета Зямля (16+).

## Discovery

**8.00, 15.05** Махінатары (12+).
**8.45, 20.11** Як гэта зроблена? (16+)
**9.10, 6.28** Брудная работка: незаменныя (16+).
**10.00** Залатая ліхаманка (16+).
**11.41** Дзіўныя сувязі (12+).
**13.23, 22.18** Дальнабойшчык на шашы-66 (12+).
**14.14, 5.42** Праклён Бярмудскага трохвугольніка (12+).
**19.20** Як гэта ўладкавана? (12+)
**21.27** Узрываючы гісторыю (12+).
**23.09** Сямейка Осбарнаў — праўда ці хлусня (16+).
**0.00, 7.14** Паліцыя Іспаніі (16+).
**0.51** Самагоншчыкі (18+).
**1.42** Каралі аўкцыёнаў (12+).
**2.33** Утыльшчыкі (12+).
**4.56** Майстры патагравацца (16+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліюецца са скрытымі субцітрамі.*

### Беларусь 1

**6.30 Меладрама «Роднае сэрца» (16+).**
8.20 Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал» (12+).
**9.40** Гісторыі збаўлення (12+).
**10.15** «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
**10.45** Маршрут пабудаваны (12+).
**11.20, 12.35 Меладрама «Дочкі-маці» (16+).**
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**13.30** «Я ведаю» (6+).
**15.15** Дай пяць (6+).
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** «Нагода ёсць» (12+).
**16.45, 19.10 Серыял «Аднакласнікі смерці». 1—4-я серыі (16+).**
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.05 Меладрама «Былая». 1—4-я серыі (16+).**

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
**8.00, 19.40** Тэлебарометр.
**8.05 «Клон». Серыял (16+).**
**10.00** М/с «Пінгвіны з Мадагаскара» (0+).
**10.20 Фільм-катастрофа «Армагедон» (12+).**



**12.50** «На нажах» (16+).
**13.45** «Тата папаў» (16+).
**15.25** «Мяняю жонку» (16+).
**17.10** «Вежа» (12+).
**17.55 Камедыя «Лэдзі ў фургоне» (12+).**
**20.10** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15 Камедыя «Рыкі і Флэш» (16+).**
**23.05** «Каханне на выжыванне» (16+).

### Беларусь 3

**7.30** «Святыні Беларусі».
**8.00, 12.55** Навіны культуры.
**8.20** «Ізноў двойка». М/ф (0+).
**8.40 «Каханая жанчына механіка Гаўрылава». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.25** «Беларуская кухня». Лешч, запечаны ў гліне.
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.45** «Народны майстар». Уладзімір Станкевіч (бондарства).
**12.15** «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
**13.15** Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча «Мамiна пласцінка».
**14.05 «Жандар на прагулцы». Маст. фільм (12+).**
**15.45** А. Барадзін. «Князь Ігар». Опера Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.
**18.20 «Адзінокім даецца інтэрнат». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**19.50** «Кадры жыцця».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Бітва за Маскву». «Тайфун» (12+) [СЦ].**

### Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.10** Тэніс. WTA. Мельбурн.
**9.20** Баскетбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2021. Жанчыны. Польшча — Беларусь.
**11.10** Сняданак чэмпіёнаў.
**11.40** Грэка-рымская барацьба. Чэмпіянат Беларусі.
**13.30** Вялікі спорт.
**14.15** Піт-стоп.
**14.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі.
**16.50** Хакей. КХЛ. ХК «Сочы» — «Дынама-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**19.20, 22.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.20** Вынікі тыдня.
**23.55** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург).

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** [СЦ] Нашы навіны.
**7.10** «Здароўе» (16+).
**8.10** «Жыццё іншых» (12+).
**9.10** «Метэагід».
**9.30** «Народны кухар» (12+).
**10.50 Фільм «Асабістыя абставіны» (16+).**
**12.40 Серыял «Каб убачыць вясёлку, трэба перажыць дождж» (16+).**
**16.20** «Я амаль знакаміты» (12+).
**18.15** Юбілейны канцэрт Ігара Мацвіенкі (12+).
**20.00** Контуры.
**21.20** «Беларусь. Здабытак Рэспублікі» (16+).
**22.10** «Спартклуб» (16+).
**22.30** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Кубак чэмпіёнаў (16+).
**0.20** «Міхаіл Жванецкі. Вам дапамагчы ці не перашкаджаць?» (16+).

### СТБ

**6.45** «Таямніцы Беларусі».
**8.20** Дакументальны праект (16+).
**9.10** «Мінтранс» (16+).
**10.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.30** «Вялікі горад».
**11.00** «Невядомая гісторыя» (16+).
**12.35, 13.40, 16.40 «Аўташкола». Серыял (12+).**
**13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**19.30** «Тыдзень».
**21.20** Дакументальны спецпраект (16+).
**22.55** «Засакрэчаныя спісы» (16+).
**1.25** «Дзень рускіх герояў». Дакументальны спецпраект (16+).

### МІР

**5.00** Мультфільмы (12+).
**6.25** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
**6.50 Маст. фільм «Саламяны капялюшык» (12+).**
**9.25** «ФазэндаЛайф» (12+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10, 16.15, 19.30 Серыял «Форс-мажор» (16+).**
**18.30, 0.00** «Разам».
**22.45, 1.00 Серыял «Вышэйшы пілатаж» [СЦ] (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.05 Серыял «Трымайся за аблокі» (12+).**
**11.00 Маст. фільм «Разарваныя ніткі» (12+).**
**14.30 Маст. фільм «Белая сукенка» (12+).**
**16.30 Маст. фільм «Незнаёмка ў люстэрку» (12+).**
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** «У людзях».
**21.35** «Таямніцы Беларусі» (16+).
**22.25** Масква. Крэмль. Пуцін.
**23.05** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.10** Элементарыум (6+).
**6.45** Беларусы (6+).
Жыхары таксама падтрымалі ініцыятыву сельвыканкама, адрамантавалі, пафарбавалі агароджу, навялі парадак на дваровых тэрыторыях. Варта сказаць, што работа, распачатая перад дажынкамі, працягваецца, — расказвае далей Аляксандр Вячаслававіч. — Скажам, да дажынак адрамантавалі фасад Дома культуры, абнавілі дах, а шклопакеты на вокнах культурнай установы ўдалося памяняць перад надыходам зімы. Зараз сельгаспрадпрыемства працуе над падрыхтоўкай былога будынка майстэрні пад перабудову яго ў фізкультурна-аздараўленчы комплекс.

**Старшыня Маларыцкага раённага Савета Алег ЯКУБЧЫК** адзначыў, што ў Хацілаўскім сельскім Савеце шмат робіцца па добраўпарадкаванні тэрыторыі і падтрыманні парадку. Блізкасць горада накладвае свой адбітак. Напрыклад, тут у адрозненне ад іншых сельсаветаў зусім няма пустуючых дамоў. Жыллё хутка набываюць гараджане пад лецішчы, сельгаспрадпрыемства таксама гатовае купіць і адрамантаваць дом для сваіх работнікаў. Сельвыканкам, мясцовыя дэпутаты прыкладаюць намаганні, каб адпавядаць прыгараднай тэрыторыі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Маларыцкі раён.*



Новая дзіцячая пляцоўка.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 28 студзеня 2021 года.

Спецыяльны рэпартаж

# Паштальён на колах,

## або Асаблівасці працы вясковага кур'ера


Аляксандр з усімі знаходзіць агульную мову.

**Аляксандр БОЛЦІКАЎ — кіроўца-паштавік Краснапольскага ўчастка паштовай сувязі, развозіць па вёсках газеты, карэспандэнцыю, пенсіі і грашовыя дапамогі. А ў Краснаполлі выконвае яшчэ і абавязкі кур'ера, дастаўляе паскораную пошту EMS. Дарэчы, паслуга з кожным днём набірае папулярнасць, бо атрымаць або адправіць каштоўную карэспандэнцыю, напрыклад, пашпарт, не выходзячы з дому, вельмі зручна і камфортна. Тым больш што гарантыя дайсці да адрасата ў гэтым выпадку стапрацэнтная. У вялікім горадзе такіх кліентаў больш, там нават асобны чалавек працуе кур'ерам, але Краснаполле — невялікі населены пункт, і Аляксандр спраўляецца і баранку круціць, і пенсіі развозіць, і каштоўныя пакеты па кур'ерскіх адрасах дастаўляе.**

З сямі раніцы Аляксандр ужо на рабоце. Трэба прыняць тавар і ўзгадніць з начальствам маршрут. Самы «гарачы» перыяд для яго — гэта дні выплаты пенсій. Прызнаецца, што прыходзіцца часам накручваць па паштовым «уазіку» да 100 кіламетраў. У астатні час крыху паспакайней. Усяго на абслугоўванні паштальёна 11 вёсак, але ён заязджае толькі ў тыя, куды трэба нешта даставіць. На ўчастку, напрыклад, 60 чалавек выпісваюць газеты, людзі з нецярпеннем чакаюць свежых навін. Але сёння дзень будзе доўгі — трэба спяшацца даставіць пенсіі і грашовыя дапамогі. У кабіну да кіроўцы нельга, ведамасныя правілы забараняюць. Паназіраць за працэсам дапамог **старшыня Сідараўскага сельсавета Уладзімір ПІВАНАЎ** — узяў мяне ў сваё аўто. Заадно паказаў, чым жыве яго сельсавет.

Першая вёска, дзе чакаюць пошту, — Кажамякіна, але перад тым як да яе дабрацца, прыйшлося зрабіць некалькі прыпынкаў — Аляксандр развозіў карэспандэнцыю па арганізацыях.

— Калісьці вёска вялікая была, — згадвае старшыня сельсавета, як толькі мы заязджаем у населены пункт. — У свой час тут мелся васьмігадовая школа і іншыя сацыяльныя аб'екты. Зараз 50 чалавек засталося. Дзяцей няшмат, іх цяпер возяць у школу ў Краснаполле. Тыя жыхары, якія пакуль яшчэ не на пенсіі, працуюць у цэху ад лясгаса. Вёсцы, лічы, пашчасціла, што ёсць такі аб'ект. Мясціны ж вельмі прыгожыя, лес навокал, крынічкі.

У Кажамякіне трэба заехаць па трох адрасах. 82-гадовая Ніна Ведзянееўна жыве з сынам. Як толькі паштовы «ўазік» прыпыняецца каля яе дома, жанчына з'яўляецца на ганку. Чакаем, пакуль Аляксандр абслужыць кліентку, і падыходзім пагаманіць. Ці ўсё ж задавальняе?

— Раней у вёсцы пошта была, але і так нядрэнна — на дом усё прывозяць, не трэба нікуды хадзіць, — кажа пенсіянерка. — Паштальён нам чалавек не чужы, уважлівы. Дзякуй яму за клопат.

Аляксандр цікавіцца, можа трэба нешта з прадуктаў прывезці. Ён жа не толькі карэспандэнцыю дастаўляе, але і тавары першай неабходнасці. На ўсялякі выпадак запісвае нумар тэлефона, па якім можна зрабіць заказ. Камунальныя плацяжы, дарэчы, таксама можна такім чынам аформіць. А квітанцыю на месцы атрымаць.

Развітваемся з Нінай Ведзянееўнай і едзем далей, да Аксаны — маладой маці, якая чакае грашовую дапамогу на дзіця. Вунь яе дом на пагорку. Але дзе ж гаспадыня? Нас сустракае бадзёрым брэхам дваровы барбос. Вось табе неспадзяванка. Аляксандр супакойвае: не хвалюйцеся, у кішэні ляжыць абарона, калі што. Пошта сваіх работнікаў забяспечвае на такія выпадкі сродкамі абароны. На гарызонце з'яўляецца Аксана, цыкае на свайго ахоўніка, і ён нас прапускае.

— У мяне трое дзяцей, двое дарослых, але малому — тры месяцы, без нагляду не пакінеш, таму і затрымалася, — апраўдваецца Аксана.

Аляксандр выдае ёй грошы і нагадвае пра тое, што яна можа скарыстацца і іншымі паслугамі. Яна дзякуе і абяцае падумаць.

Наступны прыпынак амаль за ўскрайку вёскі. Дом стаіць у вельмі маляўнічым месцы. Здаецца, калі б фарбы былі пад рукой, адразу ж нешта намаляваў. Нас сустракае каларытная бабулька. Нечаканая ўвага з майго боку яе нават бянтэжыць. Амаль кожны сказ у яе пачынаецца з разгубленай прымаўкі «вой, мая мамачка».

— Газеты ўжо даўно не чытаю, — прызнаецца 83-гадовая Кацярына Іванаўна. — Без акуляраў вас ледзь бачу. Маладзейшая была, дык на паўгода адну газету выпішу, потым другую. І паштоўкі купляла, родным пасылала. Але бацькі ўжо памерлі, а сястра ў Слаўгарадзе жыве. Мы з ёй часам па тэлефоне размаўляем. А яшчэ ёсць дзеці. Адзін сын тут жыве, яшчэ адзін у Краснаполлі і дачка ў Касцюковічах. Дачка раней кожныя выхадныя прыязджала, але зараз у яе муж хварэе на каранавірус, і яна баіцца прыязджаць, каб мяне не заразіць. Але я не сумую, нявестка ў госці часта прыходзіць. Нядаўна сын з дзецьмі з Краснаполля прыязджаў, лазню тапілі.

Напрыканцы робім здымак на памяць. Жанчына какетліва прызнаецца, што раней прыгажуня была. Яна, дарэчы, і зараз нядрэнна выглядае. Вунь валасы як у маладой. Смяецца, што ніколі фарбамі не карысталася, але зараз «на старасці гадоў» за яе знешнім выглядам дачка сочыць.

— Работа ў мяне цікавая, — прызнаецца Аляксандр. — Людзі да мяне ўжо прывыклі, некаторыя нават на гарбату запрашаюць, але прыходзіцца адмаўляцца — я ж на рабоце і трэба прытрымлівацца дысцыпліны. Ды і часу няма, справа перш за ўсё. Бабулькі вельмі чуллівыя, часам цукеркамі частуюць. А ёсць наогул «пустэльнікі», адзін чалавек на ўсю вёску. Але і такіх абслугоўваем, а куды дзявацца.

Тое, што прыходзіцца ездзіць па маланаселеных вёсках, Аляксандра не хвалюе. Хоць, бывала, і машына ламалася. Але хутка знаходзіў выйсце з сітуацыі.

А яшчэ мы даведаліся, што Аляксандр шматдзетны бацька — у яго пяцёра дзяцей. Усе яшчэ малыя, старэйшы ў трэці клас ходзіць. А яшчэ кажуць, што моладзь у маленькіх населеных пунктах не прыжываецца. Калі ёсць дом, сям'я і работа — па гарадскім жыцці ніхто не сумуе.

Аляксандр едзе далей па маршруце, а мы вяртаемся ў Краснаполле. Трэба ж пацікавіцца, якія паштовыя паслугі цяпер у трэндзе.

— Стараемся прапагандаваць новыя формы, — кажа **начальнік Краснапольскага УПС Людміла ЧМЫРЫКАВА.** — Жыццё на месцы не стаіць, і мы таксама прапануем кліенту больш зручныя варыянты. Тая ж паскораная пошта EMS, напрыклад. Яна, канешне, даражэйшая, але перавагу у яе шмат. Дастаўляем такім чынам кліенту на дом дзелавую перапіску, тавары — людзі сёння шмат чаго замаўляюць праз інтэрнэт. Асабліва часта карыстаюцца паслугай тыя, каму далёка да нас дабірацца. Летась па Краснаполлі рост па гэтай пазіцыі склаў 140 працэнтаў да ўзроўню папярэдняга года. Яшчэ па адной — «Камфорт» — рост наогул амаль 160 %. Прынцып, дарэчы, той самы, дастаўка карэспандэнцыі да дома або кватэры ў абумоўлены кліентам час. Наша задача, каб кліенты не адчувалі сябе адарванымі ад жыцця і карысталіся ўсімі перавагамі, якія ёсць і ў гараджан.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**


Паштальёна заўсёды чакаюць і сустракаюць.

Падрабязнасці

# Найлепшую марку выберам разам

**Да 25 лютага праходзіць конкурс-апытанне «Найлепшая паштовая марка Рэспублікі Беларусь». Паўдзельнічаць у ім могуць усе ахвотныя. А для гэтага трэба зрабіць усяго некалькі крокаў.**

На афіцыйным сайце РУП «Белпошта» belpost.by ў раздзеле «Філатэлія» выкладзены бланк анкеты. Яго трэба запоўніць, указаўшы нумар маркі ці блока, якія спадабаліся больш за іншыя. Гэты бланк пасля трэба будзе даслаць на электронны паштовы адрас vinch@belpost.by.

Запоўніць анкету таксама можна і афлайн. Для гэтага трэба наведаць любое аддзяленне паштовай сувязі краіны. Разборліва запоўненую анкету з паметкай «Конкурс» трэба накіраваць на адрас: выдавецкі цэнтр «Марка» РУП «Белпошта», пр-т Незалежнасці, 10, 220050, г. Мінск. Але, праз сітуацыю з каранавірусам усё-такі лепш абраць электронны варыянт.

— Сярод удзельнікаў апытання, у чыіх анкетах указана найлепшая паштовая марка, будуць разыграны прызы. Гэта 100 набораў філатэлістычнай прадукцыі. Але трэба даслаць анкеты ва ўказаны тэрмін і правільна запоўніць. Найлепшай будзе прызнана тая паштовая марка (альбо блок), за якую прагаласуе большасць удзельнікаў, — адзначылі ў прэс-службе «Белпошты».

# Як не трапіць на вуду махляроў

**Апошнім часам Беларусь літаральна накрыла хваля кібермахлярства. Не абышла яна і паштовую сферу. Ашуканцы ствараюць у сеціве ледзь не копію сайта нацыянальнага паштовага аператара. А для большай праўдападобнасці яшчэ і карыстаюцца даменнымі імёнамі, якія ад сапраўднага belpost.by адрозніваюцца літаральна адной ці парай літар.**

— Гэтая схема працуе наступным чынам, — расказалі ў прэс-службе нацыянальнага паштовага аператара. — Дапусцім, вы апублікавалі на гандлёвай інтэрнэт-пляцоўцы аб'яву аб тым, што хочаце прадаць або, наадварот, набыць нейкі тавар. Зламыснік, які выступае ў ролі другога ўдзельніка здзелкі, уступае з вамі ў камунікацыю шляхам інтэрнэт-месенджараў. Далей ён прапануе скарыстацца паслугамі РУП «Белпошта». Але адпраўляе спасылку на фішынгавы сайт. У рэшце рэшт чалавек, які пераходзіць па гэтай спасылцы і ўводзіць у палі даныя сваёй банкаўскай карткі, тут жа яе кампраметуе. І банкаўскі рахунак спусташаецца вокамгненна. Таксама заўважаныя выпадкі рассылкі на электронныя паштовыя адрасы паведамленняў, у якіх змешчана інфармацыя пра аплату дастаўкі замоўленага тавару. Далей яны зноў жа прапануюць перайсці на сайт, які насамрэч з'яўляецца несапраўдным.

Таму калі вы заўважылі, што вам адпраўляюць нейкія спасылкі, прапануюць паведаміць нейкі код, ці вас збянтэжыў тэлефонны код нумара, на які зарэгістраваны акаўнт, з якога вядзецца перапіска — проста спыніце дыялог.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Сведения о результатах проведения рекламной игры

# «Загадывай – сбудется!»

**Сведения об организаторе –** является Общество с ограниченной ответственностью «ЭфСиБи Бел» (далее – Организатор), УНП 193185741.

**Юридический адрес:** Республика Беларусь, 220037, г. Минск, пер. Козлова, д. 25, пом. 22.

**Территория проведения рекламной игры:** магазины «Виталюр», расположенные на территории Республики Беларусь.

**Срок начала рекламной игры:** 18.11.2020.

**Срок окончания рекламной игры:** 30.01.2021.

**Сведения о государственной регистрации рекламной игры:** свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3878 от 30.10.2020, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

**Сведения о количестве участников рекламной игры:** 121 805 участников.

Призовой фонд разыгран полностью.

**Победители:** полная информация о победителях Рекламной игры и их выигрышах опубликована по ссылке **https://vitalur.by/2021.**

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры:** +375 (29) 322 42 52. Время работы горячей линии: с 9.00 до 21.00 пн–пт, с 10.00 до 16.00 сб–вс.

## Извещение об аукционе 12 февраля 2021 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| **Наименование объекта** | **Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-46622 «Здание компрессорной с ремонтно-механическим участком, цех доборных изделий»** | **Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44951 «Здание очистных сооружений»** |
|---|---|---|
| **Номер лота** | 1 | 2 |
| **Местонахождение объекта** | г. Пинск, ул. Калиновского, 11У | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Ю |
| **Тип помещения** | Отдельно стоящее | Отдельно стоящее |
| **Общая площадь (кв. м)** | 1930,1 | 205,0 |
| **Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)** | 0,3941 | 0,1879 |
| **Начальная цена продажи (бел. руб.)** | 341 298,70 | 35 357,51 |
| **Шаг аукциона** | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены |
| **Сумма задатка (бел. руб.)** | 34 129,87 | 3 535,75 |
| **Условия продажи** | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Единовременный платеж |
| **Характеристика объекта** | Одноэтажное. Состоит: здание компрессорной 306 кв. м, помещение цена доборных изделий 1456 кв. м, пристройка 12 км. м, навес 24 кв. м, градирня 33 кв. м, два теневых навеса 7 кв. м. Покрытие бетонное 1030 кв. м. Ввод в эксплуатацию – 1970 г. | Здание одноэтажное, кирпичное, с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть). Резервуары для воды – 2 шт. Ввод в эксплуатацию – 1994 г. |

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» |
| **Продавец аукциона** | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» |

**Аукцион состоится 12 февраля 2021 года в 11.00 по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале ОАО «ПКСИ».**

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинским комбинатом строительной индустрии».

**2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/счет BY16BAPB30124701200210000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X , УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – по 11 февраля 2021 г. включительно.**

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за пять дней до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 11 февраля 2021 года включительно, тел. 80165-37-16-19, тел./факс (80165) 37-16-66, 37-17-25. Контактный телефон 375-29-640-80-37**.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Молодечненский станкостроительный завод», ул. Замковая, 19, 222310, г. Молодечно** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Здание блока вспомогательных цехов** (здание специализированное для металлургического производства и металлообработки) общей площадью 2676,8 кв. м, инв. номер 630/С-79012, по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Замковая, 19М.

**Составные части и принадлежности:** навес на металлических столбах, асфальтное покрытие

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания блока вспомогательных цехов общей площадью 0,6144 га

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **167 293,02 белорусского рубля (снижение 50 %)** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 3 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронного аукциона в газете «Звязда» от 15.01.2021 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
**Начало торгов: 10.00 09.02.2021 г.**
**Окончание торгов: 11.00 09.02.2021 г.**

Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 08.02.2021 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

УНН 190431606

## УП «Белконфискат»

**объявляет о проведении электронных торгов 18.02.2021 г. по продаже имущества Шамрук Д. Г.**

**автомобиль Volvo V70, 2002 г. в.,**

**начальной стоимостью 7 200 рублей.**

На сайте **belkonfiskat.by** размещена информация о торгах. Справки по тел. **8 (017) 3639489.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-47034 (назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения, наименование – здание механической мастерской), общей площадью 325,3 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Дитвянский с/с, 13/1 мехмастерская в районе д. Евсеевичи.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 423683200027000025, площадью 1,3546 га (назначение – для обслуживания здания механических мастерских), расположенном по адресу: Лидский р-н, Дитвянский с/с, в районе д. Евсеевичи. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,0314 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,1053 га.

Обременений со стороны третьих лиц нет.

**Начальная цена продажи лота – 840 руб. (восемьсот сорок рублей) с учетом НДС.**

**Сумма задатка – 84 руб. (восемьдесят четыре рубля)**

ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 420/С-47032 (назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения, наименование – здание гаража), общей площадью 817,5 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Дитвянский с/с, 13/2 гараж в районе д. Евсеевичи.

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 423683200027000026, площадью 1,1350 га (назначение – для обслуживания здания гаража), расположенном по адресу: Лидский р-н, Дитвянский с/с, в районе д. Евсеевичи. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,0485 га.

Обременений со стороны третьих лиц нет.

**Начальная цена продажи лота – 3 624 руб. (три тысячи шестьсот двадцать четыре рубля) с учетом НДС.**

**Сумма задатка – 362 руб. (триста шестьдесят два рубля)**

**Продавец – ОАО «Лидахлебопродукт», 231300, г. Лида, ул. Булата, 1, 8-0154-65-25-01, факс 8-0154-65-25-60**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 11 февраля 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grino.by/aukcion.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 30.07.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 09 февраля 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация http://grino.by**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Крупский плодоовощной завод»

| № лота | Наименование лота | Начальная стоимость с НДС 20 % | № лота | Наименование лота | Начальная стоимость с НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13481 (здание кисельного и горчичного цехов), площадь 813,6 м² | 6576,00 | 6 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13482 (погреб), площадь 47,4 м² | 348,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13480 (проходная), площадь 54,1 м² | 1728,00 | 7 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13560 (водонапорная башня), площадь 35,3 м² | 420,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13527 (здание цеха безалкогольных напитков), площадь 416,2 м² | 5268,00 | 8 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13479 (спиртохранилище), площадь 104,4 м² | 948,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13526 (здание цеха для брожения вина), площадь 157,7 м² | 2028,00 | 9 | Капитальное строение с инв. № 613/С-10557 (здание склада материальных ценностей), площадь 250 м² | 1068,00 |
| 5 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13477 (производственный корпус), площадь 201,6 м² | 2556,00 | 10 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13559 (артезианская скважина) | 588,00 |

*В отношении вышеперечисленного имущества проводятся тринадцатые повторные торги. Лоты расположены на земельном участке с кадастровым номером № 623050100001002242 по адресу: г. Крупки, ул. Московская, 1. Земельный участок предоставлен для обслуживания зданий и сооружений производственный базы на праве аренды до 2102 года.*

Публикация об аукционе ранее размещалась 29.09.2020 г. в газете «Звязда» № 189 (29303), стр. 15. Цена на лоты снижена на 90 %.

**Начало приема заявлений в 10.00 29.01.2021. Окончание приема заявлений в 16.00 08.02.2021**

| | |
|---|---|
| **Задаток** | 10 % от начальной стоимости предмета торгов |
| **Шаг аукциона** | 5 % от начальной стоимости предмета торгов |
| **Организатор торгов** | ООО «Фрондера», тел. +375 29 308 28 97; e-mail: info.torgi@orgtorg.by |
| **Информация о продавце** | ОАО «Крупский плодоовощной завод», Минская область, г. Крупки, ул. Московская, д. 1 (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 29 304-59-90) |
| **Дата и время проведения торгов** | **9 февраля 2021 года в 13.00 (регистрация с 12.30 до 12.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д.1, оф. 1121 |

Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121 либо по электронной почте: info.torgi@orgtorg.by

**Условия для участия в торгах**

1. До подачи заявления внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Крупский плодоовощной завод» (Лот №__), проводимом __.__.202_г.».

2. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте **https://orgtorg.by/info.** Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Победитель аукциона оплачивает затраты на организацию и проведение торгов (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации, согласно выставленному счету) в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях после возмещения победителем затрат на организацию и проведение торгов в течение 14 (четырнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 10 % от конечной цены предмета торгов.**

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов: +375 29 304-59-90




## ПАКУЛЬ НЕ ПРЫЕХАЛА ЦЕШЧА

...Гэта было першае каханне — пяшчотнае, трапяткое, шчымлівае і, як ні дзіўна, узаемнае. Калі яно пачалося, ні Аня, дачка старшыні калгаса, ні Ваня — сын старшыні сельсавета, не ведалі. З маленства разам раслі, вучыліся ў адным класе... Аднак выдаць свае пачуцці ніяк не маглі: ён лічыў, што сапраўдным мужчынам такія сантыменты не да твару, яна і пагатоў... А таму — бог ведае, чым завяршылася б гэта гісторыя, калі б не мудрая дырэктарка школы, якая ў выпускным класе пасадзіла іх разам за апошнюю парту, сказаўшы, што вось так з двух найлепшых вучняў можа атрымацца хоць адзін медаліст.

І сапраўды, Аня выпраўляла памылкі ў сачыненнях Вані, ён дапамагаў суседцы з фізікай і хіміяй. Такім чынам яны неўпрыкмет зблізіліся: перад выпускным іх ужо звалі жаніхом і нявестай...

А там, як і варта было чакаць, Аня атрымала сваё «золата» (Ваню падвяла нямецкая мова) і адразу паступіла ва ўніверсітэт, ён, не дабраўшы паўбала, праляцеў міма. Восень і зіму неяк перакантаваўся (скончыў курсы кіроўцаў) і вясной «загрымеў» у войска.

Аня, паабяцаўшы, верна чакала яго ды вучылася (як бацьку тым часам перавялі на работу ў Мінск, выдзелілі кватэру), аднак, дачакаўшыся, замуж не кінулася: сказала, што не хоча быць жонкай хоць бы і таксіста — іншая справа студэнт...

Гэтым разам Ваня паступіў лёгка, атрымаў месца ў інтэрнаце.

Адзначыць і адно, і другое Аня запрасіла да сябе: трэба разумець, хацела паказаць жаніху кватэру, свае кулінарныя здольнасці, а, можа, і праверыць, ці праўда, што савецкія воіны такія рашучыя, як паказваюць у кіно ды па тэлебачанні?

...Карацей, Ваня прыбраўся ў новы касцюм, купіў пляшку каньяку і выправіўся ў госці. Пачуўшы, што бацькі ў ад'ездзе, трохі сумеўся, але і павесялеў: скінуў пінжак, зняў ненавісны гальштук, без цырымоній рассеўся за прыгожа накрытым сталом.

Гаспадарскае віно галантна пакінуў Ані, сам папрасіў дазволу пакаштаваць прынесены каньяк.

Першыя два кілішкі ён як чалавек культурны закусіў скрылькамі сыру-каўбасы ды салатай з агуркоў... На гарачае гаспадыня абяцала маміну каронную страву — катлеты па-кіеўску.

Чым яны адрозніваюцца ад мінскіх, Ваня тады не ведаў (у Кіеве не быў), а таму і сюрпрызаў ніякіх не чакаў. Пасля трэцяга кілішка ён адсунуў прапанаваны нож, падчапіў на відэлец пукатую залацістую катлету, адкусіў і...

У той жа момант адчуў, як на падбароддзе, руку, сцягно і тое месца, дзе зашпіляюцца штаны, пырснула нечым гарачым.

— Гэта масла, — вінавата зашчабятала Аня. — Трэба было сказаць, каб еў на талерцы, з нажом. Прабач! Я зараз...

Апошнія словы чуліся ўжо з кухні. Сігануўшы туды, Аня вярнулася з ладнай пасудзінай і так спрытна стала сыпаць соль на ягоныя штаны, што бравы сяржант ушчэнт разгубіўся: падумаў, ці не разбэсціла сталіца яго дзяўчыну? Але ж у вачах яе было столькі клопату, што хлопец паспакайнеў і стаў выбачацца сам. Маўляў, вінаваты ж: госці ёсць госці, правілы этыкету ніхто не адмяняў... Да таго ж і ўрэшце, халера з імі, тымі новымі штанамі: да вяселля можна яшчэ адны справіць...

Яны яшчэ трохі пасядзелі за сталом, з'елі па катлеце, — праверылі штаны: соль, на жаль, не дапамагла.

— Свежыя плямы павінны адмыцца. Можа, паспрабуем? — няосмела прапанавала Аня.

Ваня згадзіўся.

...Што далей было, здагадацца няцяжка. Штаны — гэта ж не насоўка і нават не кашуля: яны сохлі доўга. Івану прыйшлося застацца ў Ані...

І назаўтра таксама, бо плямы не адмыліся і порткі прыйшлося здаваць у хімчыстку.

Гэта па-першае, а падругое, катлеты ў халадзільніку яшчэ заставаліся. Іх трэба было навучыцца есці, пакуль не прыехала цешча.

**Я. Радына,**
*г. Мінск.*

## АДНА Ў ЧАЛАВЕКА БЫЛА ЗАГАНА...

Летам 1949-га ў нас на Лунінеччыне пачалася калектывізацыя — з'явіліся калгасы.

Першых кіраўнікоў — старшынь — выбіралі з людзей тутэйшых, аўтарытэтных, пазнейшых — сталі прысылаць здалёку, у асноўным з усходніх абласцей краіны.

Не бяруся казаць за іншых, — а вось наш той наездкі старшыня быў гаспадаром нядрэнным: і калгасам кіраваў не без поспехаў, і дома ад работ не ўцякаў: трымаў на падворку і свінней, і курэй, і карову... Адзінае — недачуваў.

Дык вось. Ішоў ён неяк з канторы, спыніўся каля групы мужчын — павітаўся, а заадно пачуў, што тыя гамоняць пра дзядзьку Пэкуля, пра яго свінаматку з парасятамі.

У старшыні тут быў інтарэс, таму ўсё, што пачуў, ён дома пераказаў сваёй жонцы, і ўжо разам з ёй вырашыў, што назаўтра трэба схадзіць да гэтага Пэкуля і купіць у яго парсючка.

Грошай старшыня ўзяў з запасам (таргавацца не выпадала), мяшок пад пахай зацісну і пакіраваў на знаёмы падворак. Зайшоў у хату. Бачыць, што з дарослых там нікога няма, толькі сынок, першакласнік, сядзіць за сталом — урокі робіць.

— А дзе бацькі? — пытае яго старшыня.

— Паехалі парасят купляць.

— Як купляць? Людзі ж казалі, што ў вас сваіх да халеры. І свінаматка ёсць...

— А... Дык гэта ў кухні! — скеміў малы.

— Як гэта ў кухні? — не зразумеў старшыня.

— Ды пайшлі, пакажу.

Заходзяць у кухню, а там на... сцяне, на карціне — і сапраўды вялікая свіння і з дзясятак парасят. Парсючкі сярод іх, відаць, таксама былі... Шкада — не прадаваліся.

Дарэчы, з гэтым Пэкулем яшчэ адна прыгода была.

Наш калгас тады вырошчваў лён. Тут жа, на месцы, яго апрацоўвалі да кудзелі, якую потым адвозілі ў раён, а ўжо адтуль — на льнозавод.

Дык вось неяк у кабінет да старшыні заходзіць брыгадзір, кажа, што патрэбна машына, каб паклю завезці.

Старшыня ў адказ:

— Яшчэ чаго?! Што ён за начальнік, каб яго машынай вазіць? Няхай пешшу сходзіць, калі нешта трэба.

— Дык я ж не пра Пэкуля, — бянтэжыцца брыгадзір. — Я пра кудзелю — пакулле...

— Дык так бы і сказаў!

...Людзям цяжка тады жылося: шмат было ўдоў і дзяцей-сірот, мужчын, што з вайны прыйшлі інвалідамі. Той без рукі, той без нагі... «Дрэнна ім», — спачуваў старшыня.

Можа, таму, што і самому часам няпроста было, хоць ён усяго толькі недачуваў.

**Васіль Нефідовіч,**
*в. Ляхаўка,*
*Лунінецкі раён.*

## «КАЛІ НАВУКА ПОЙДЗЕ ТУГА...»

Малым, як вядома, хочацца шмат чаго — пачуць, убачыць, пакаштаваць, і пасябраваць са старэйшымі дзецьмі, у іх жа нечаму навучыцца...

Мне тады гадоў шэсць было, брату — сем. Мы не мелі ровара, а ў дванаццацігадовага Віцькі Камісарава — быў, і ён, той Віцька, абяцаў, што навучыць нас катацца, але ж... Вечна ў яго работ поўна рот.

Мы нават ведалі, чаму. Таму што з раніцы і з такімі ж вось хлопцамі ён хадзіў у лес, каб назбіраць патронаў і потым «рвануць» у вогнішчы, далей — на рэчку, каб купацца і кашамі лавіць уюноў... Карацей, часу, каб даглядаць куранят, падмятаць двор, насіць ваду, рваць траву для свіней, збіраць ападкі, кароў у Віцькі не было.

Мы з братам зналі, што працаваць за яго — нядобра. Нядобра і пакрываць, ведаючы, што той лазіць у сад да дзеда Міколы...

А з іншага боку, такіх яблыкаў (сакавітай, смачнай малінаўкі) на нашай вуліцы больш не меў ніхто! Выспявалі яны ці не першыя, а дзед Мікола скваліў яшчэ той: нікога ніколі не частаваў, не кажучы ўжо пра тое, каб вынесці кошык (хоць бы ападу) і паставіць на вуліцы, як гэта рабілі іншыя...

Не дзіва, што ў вёсцы старога недалюблівалі і за вочы празвалі Кукам. (Ён, казалі, партызаніў, аднак пасля наступлення Чырвонай Арміі да вайскоўцаў не прымкнуў: у лесе кукаваў да самай Перамогі, таму і Кук)...

Дык вось аднойчы Віцькава маці такі «адхадзіла» сына матузамі за Міколавы яблыкі. Ну як было хлопцу такое сцярпець?!

...План помсты дзед Мікола міжволі падказаў яму сам. Неяк — у парадным касцюме, у капелюшы — ён пайшоў да свайго родзіча на другі канец вёскі. Значыць, адтуль — пачаставаны і ў добрым настроі — павінен будзе вяртацца дамоў?

Віцька вырашыў падпільнаваць яго.

Для гэтага паклікаў нас з братам і паставіў умову: хочаце, каб я навучыў вас ездзіць на ровары, тады залезьце на таполю, і калі дзед Мікола з ёй параўняецца, пракрычыце: «Дзед Кук сеў на сук, сук зламаўся, Кук...» (Ну, вы здагадаліся).

Нас угаворваць не прыйшлося: Віцька падставіў лесвіцу, мы сiганулі ўверх і надзейна схаваліся ў лістоце. А там...

Вось яна, урачыстая амаль хвіліна: дзед Мікола з пыльнай дарогі збочыў на сцежку пад дрэвам, і мы з Сашам выдалі Віцькаў «верш».

Дзед Кук, як нам здалося, збянтэжыўся, аслупянеў, паглядзеў уверх і, ні слова не сказаўшы, рушыў... да нас у двор.

Убачыўшы гэта, нам з братам расхацелася злазіць з таполі, ісці дадому, але ж час быў вячэраць, нашы прыйшлі з работы...

Не падымаючы галоў і ног, мы сунуліся ў бок хаты. На дварэ нас сустрэў наш старэйшы брат: яму 14, і ён у час канікулаў ужо працаваў у саўгасе...

А далей былі маміны словы пра тое, што мы, маўляў, зганьбілі не дзеда, а сябе і сваю сям'ю... І, вядома ж, татава дзяжка, хоць баяліся мы не столькі яе, колькі таго, што зараз нас пагоняць да Кука прасіць прабачэння.

Так яно, можа, і было б, каб не анёл-ахоўнік, каб не бабуля. Нас, зарумзаных, яна схапіла за рукі і са словамі «Брындаеце недзе... Робіце абы-што... А ну хутчэй мыцца!» пацягнула да начовак з вадой.

...У той раз мы з братам елі стоячы (сесці не маглі).

І назаўтра баяліся выйсці з хаты, чакалі насмешак сяброў, бо ўсе ж былі «ў курсе». Аднак, як ні дзіўна, нас ніхто не дражніў, а наадварот — усе прапаноўвалі пагуляць у квача, у дамкі, у бітавога... Да таго ж брата праз пару дзён навучылі катацца на веласіпедзе.

Што яшчэ было потым? Віцьку (ад бяды падалей) маці пачала вадзіць на работу: казала, дома з яго ўсё адно не памочнік... А мы з братам сталі вучыцца жыць сваім розумам. Усё амаль што па Коласу: «Калі навука пойдзе туга, паможа бацькава папруга».

**Ларыса Купрыянчук,**
*в. Хатоўня,*
*Рагачоўскі р-н.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# Трасца з фераmонамі,

## або Колькі каштуе «суперпрыз на барабане»

КАЛІ шукаць у вымушаным даволі працяглым знаходжанні на бальнічным хоць які пазітыў, урэшце дадумаешся да таго, што гэтыя будныя зімовыя дні без работы (асабліва калі хвароба няцяжка) — своеасаблівая магчымасць адчуць сябе... пенсіянерам. Нечакана для сябе адкрываеш невядомы свет шматпавярховіка ў спальным раёне ў той час, калі большасць яго жыхароў на рабоце. Аказваецца, жыццё ў доме ў гэты час не спыняецца: недзе гудзе дрыль вечнага рамонту, барабаніць дамашні тэлефон, а ў дзверы звоняць розныя цікавыя людзі. Цікавыя — гэта я без іроніі. Тут вам і «бежанцы», і «пагарэльцы», і сведкі Іеговы — каго толькі не носіць днём па пад'ездах жылых дамоў у пошуках здабычы. Нават ковіду не баяцца — «я ўжо два разы перахварэў» — нібы адно з адным дамовіліся аднолькава казаць.

Першыя дні я гэтых хадакоў нават на парог не пускала, але, калі сядзенне дома пайшло на трэці тыдзень, вырашыла-такі трохі сябе павесяліць. Доўга чакаць не давялося: прыемны хлопец з'явіўся ля дзвярэй гадзін у дванаццаць. «Добры дзень. Мяне завуць Павел. Ці ведаеце вы, што ў вас у раёне адкрыўся буйны магазін нехарчовых тавараў? Не ведаеце? А мы, прадстаўнікі магазіна, сёння праводзім рэкламную акцыю, каб пра яго даведалася больш людзей. Мы сёння дорым падарункі. Дазвольце, я зайду?» Усё гэта хлопец выдаў на адным дыханні — слова ўставіць не было як. Мне і сапраўды было цікава, што ж за «каштоўнасці» (і галоўнае — пачым?) ляжаць у яго вялікім чорным пакеце, і як ён гэта будзе спрабаваць мне «ўцюхаць». Прызнаюся: рэальнасць перасягнула ўсе чаканні. Я нават адразу запісала ўвесь асартымент і паслядоўнасць яго прапановы. Бо, ну праўда, — каб хацеў — не прыдумаеш.

СПАЧАТКУ з пакета прадавец Паша дастаў патэльню. «З антыпрыгарным пакрыццём, праслужыць як мінімум пяць гадоў». Кухонны рыштунак аказаўся вельмі лёгкі на вагу — хутчэй за ўсё, самы танны алюміній, пакрыты плёнкай, такое «антыпрыгарнае пакрыццё» эздзярэцца за два разы. «У магазіне гэты цуд каштуе пяцьдзясят пяць рублёў, мы ж дорым яе вам за дваццаць»... Пасля былі прапанаваныя «цуда-падушачкі для рук і ног (адну кладзём у мікрахвалеўку, другую — у лядоўню), пасля прыкладаем — і стомленасці як не было». Цана — усё тая ж — пяцьдзясят пяць рублёў, але ж «у падарунак» Паша аддаваў за дваццаць. Далей ішоў сродак з выцяжкай авакада («для твару, для рук ды і для ўсяго цела») — з той жа «зніжкай», пасля набор тарак, зробленых ледзь не з фольгі («сёння дорым за пятнаццаць рублёў»), за ім — набор для душа ў картонным пачку: мачалка, гель, ласьён, мыла, бомбачка для ванны — усё нават знешне вельмі сумніўнай якасці («у магазіне шэсцьдзясят рублёў, але для вас — дваццаць»). «А вось гэта — ведаеце што? — спрабаваў інтрыгаваць карабейнік. — Парфума з феромонамі! Ведаеце, што такое феромоны?» «Малады чалавек, я ўжо ў тым узросце, калі не толькі ведаюць, але і пачынаюць забываць, што гэта такое». Жарту Паша не зразумеў: «Толькі для вас замест ста трыццаці рублёў аддам за пяцьдзясят». Феромоны не «зайшлі» — і ў ход пайшла суровая праўда жыцця — літровая бутэлька сродку для мыцця посуду. Мяркуючы па этыкетцы, разлітага дзесьці на хутары пад Смаленскам. («Усяго дзесяць рублёў»). За столькі ж прапаноўвалася і бутэлька сродку для ачысткі труб. Далей ішоў дзіцячы пластылін у вядзерцы (за пятнаццаць).

Я ўжо крыху ачмурэла ад выкладзенай на канапе ў прыхожай кучы таннай стракатай трасцы (вельмі падабаецца мне гэты наш аналаг рускага слова «барахло»). Але гэта было яшчэ не ўсё! «Та-дам! Суперпрыз на барабане! Жамчужына нашай калекцыі!» — Паша ўрачыста выцягнуў з пакета яркі пачак з нажамі. Нажы, як павінен быў пераканацца патэнцыйны пакупнік, зробленыя ў Германіі. Аб гэтым сведчыў сцяг краіны, да якога былі прымацаваныя крылы (пэўна, ад арла з нямецкага ж герба). Ну і буйна напісаная цана — 220 еўра. Прычым, каб сумненняў не было ўжо зусім, «еўра» было напісана і значком, і словам. «Бачыце, так яны каштуюць 450 рублёў. Але ж мы дорым падарункі, таму аддам вам за 270. Ну што, колькі набораў будзеце браць?» «Нікольki». «Але ж сёння дзень сюрпрызаў, — не разгубіўся гандляр. — Таму ўсё вось гэта (шчодры жэст рукой у бок стракатай кучы на канапе, разам з нажамі) я аддам вам за ўсё тыя ж 270 рублёў... Як не будзеце браць? У вас што, няма нейкіх там ста долараў?»...

ТЭАТР аднаго акцёра ўсё ж скончыўся для акцёра заробкам. Я шчыра сказала яму, што ўвесь гэты «дэрыбас» з магазіна адной цаны купляць у яго не буду. Але, паколькі ён мяне павесяліў, гатова купіць у яго што-небудзь... за два рублі. Паша ніколькі не засмуціўся і выцягнуў аднекуль з кішэні шчыпчыкі для спагеці. На тым і пагадзіліся... Я пасля ў яго ўжо сур'ёзна спытала: адкуль такі дзіўны набор — ад парфумы з феромонамі да сродку для чысткі труб? Няўжо нельга сабраць штосьці больш лагічнае? «А навошта? Мы ж пазіцыянуем як «падарунак для ўсёй сям'і». Паасобку амаль нічога не купляюць, на гэта мы і не разлічваем. А разам — бяруць. Бо гэта ж нашмат «танней» атрымліваецца. Я вось сёння два наборы прадаў, план, лічы, выканаў. Не верыце? Глядзіце — я заўсёды пакупнікоў фоткаю для справаздачы»...

З экрана смартфона шчасліва ўсміхаліся ля кучы пакункаў пажылыя бадзёрыя жанчыны. Задаволеныя — танна купілі «падарунак для ўсёй сям'і». Што скажа сям'я, вярнуўшыся з работы і ўбачыўшы «падарунак» за сто долараў, красная цана якому — самае большае рублёў пяцьдзясят, — як той казаў, ужо іншая і зусім не такая вясёлая гісторыя.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Февраль на Драйве! Мастеркард»

**1. Организатор Рекламной игры**
Организатором Рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334. Электронный адрес: **post@forte.by.**
**2. Наименование и территория проведения Рекламной игры**
Рекламная игра имеет наименование «Февраль на Драйве! Мастеркард» (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»), находящихся в Республике Беларусь.
**3. Срок начала и окончания Игры**
Игра проводится с 01 февраля 2021 г. по 14 апреля 2021 г. (включая срок выдачи выигрыша и опубликования результатов проведения Игры).
**4. Комиссия по проведению Игры**
Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Игры (далее – Комиссия) в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.
Состав Комиссии:
Даниленко Валерий Михайлович – управляющий ООО «Рефорте», председатель комиссии;
Швед Екатерина Александровна – специалист по работе с клиентами ООО «Рефорте»;
Кричковская Светлана Владимировна – главный бухгалтер ООО «Рефорте»;
Даниленко Ольга Михайловна – специалист по рекламе ООО «Рефорте Групп»;
Чефанова Маргарита Игоревна – бухгалтер ООО «Рефорте».
**5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра**
Игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard, эмитированных банками Республики Беларусь (далее Карта Mastercard), за исключением карт Maestro и Белкарт/ Maestro, для оплаты за покупку топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть».
**6. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Игры**
6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства.
6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены Комиссии.
6.3. Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:
